# ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ ДАВЕРУ І ВЫТВОРЧАСЦІ

**Сусветнай супольнасці трэба было б узяць прыклад з дружбы, узаемападтрымкі, сумеснага развіцця Беларусі і Кітая**



(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
4 ЧЭРВЕНЯ СЕРАДА № 106 (30494)

# НАША ВАЖКАЕ СЛОВА Ў ХАРЧОВАЙ БЯСПЕЦЫ

**35-я Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Белагра-2025» адкрылася ў сталіцы**




У Мінскім міжнародным выставачным цэнтры ўрачыста стартаваў Беларускі аграпрамысловы тыдзень, які аб'ядноўвае некалькі міжнародных спецыялізаваных выставак. Галоўнай падзеяй самага маштабнага сельскагаспадарчага форуму краіны, безумоўна, стала юбілейная «Белагра-2025». Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да цырымоніі адкрыцця.

СТАР. 4–5



ЧЫСТА НЕ ТАМ, ДЗЕ ПРЫБІРАЮЦЬ...



ТЭАТР АБСУРДУ ПА-ЕЎРАПЕЙСКУ 14

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X
25106

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# КАЛІ ЛЁГКІМ НЯЛЁГКА

**Якія перадавыя методыкі ўкараняюць у РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Штогод у РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі каля 3 тысяч чалавек атрымліваюць стацыянарную дапамогу, каля 10 тысяч — у амбулаторных умовах. Тут выконваецца звыш тысячы аператыўных умяшанняў у год, з якіх 70 % — высокатэхналагічныя і складаныя аперацыі. Летась спецыялісты РНПЦ ажыццявілі каля 116 выездаў у рэгіёны, дзе пракансультавалі звыш 850 чалавек, што ў чатыры разы больш, чым у папярэднім годзе. Цэнтр абсталяваны па самых сучасных сусветных стандартах, а яго медыкі валодаюць перадавымі методыкамі пастаноўкі дыягназу і лячэння туберкулёзу, бранхіяльнай астмы, саркаідозу, а таксама хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх.

СТАР. 12

# ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ ДАВЕРУ

## Сусветнай супольнасці трэба было б узяць прыклад з дружбы,

Праграма візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай насычаная. У беларускага лідара запланаваны шэраг сустрэч у розных фарматах і перагавораў, прысвечаных разнастайным кірункам беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. У аўторак вялікая частка мерапрыемстваў мела закрыты характар. Але значэнне самога візіту беларускага лідара гэта не памяншае, хутчэй, наадварот.



Фота БелТА.

У аўторак Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з прадстаўнікамі кітайскіх дзелавых колаў. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што на сераду ў яго запланавана сустрэча са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Адным з асноўных пытанняў на ёй стане машынабудаўнічая галіна і тэхналагічная мадэрнізацыя асобных кірункаў прамысловасці ў Беларусі. «Я гэта сказаў таму, каб вы разумелі — не мне належыць выдатная ідэя, якая вельмі патрэбная нашай эканоміцы сёння. Гэта ідэя Старшыні КНР Сі Цзіньпіна, які і ў Кітаі, як мы бачым, у свеце гэта вядаюць, накіраваны на навукова-тэхнічную, скажам нават, рэвалюцыю ў машынабудаванні, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я вельмі ўдзячны свайму даўняму сябру і калегу за тое, што ён падключыў Беларусь да гэтага працэсу, які ў Кітаі набраў вельмі высокія тэмпы — мадэрнізацыі (і стварэння. — **Заўв. аўт.**) высокага ўзроўню вытворчасці».

### СТРАТЭГІЧНЫ ПАСЫЛ НА ПАШЫРАНАЕ, ПАГЛЫБЛЕНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА



Гэты візіт беларускага лідара ў КНР сапраўды асаблівы. **Першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ,** зрабіўшы акцэнт на кантэксце, расказаў журналістам, у чым яго значнасць. Па словах першага віцэ-прэм'ера, перагаворы — гэта факультатыў.

**Галоўнае — сама паездка, фармат якой не прымяняецца больш ні з адным лідарам. «Гэта сямейны сяброўскі абед. Гэта — галоўнае. На гэта настроена ўся паездка, — удакладніў Мікалай Снапкоў. — Парадак дня ў лідараў глабальны з улікам сітуацыі. Але не менш глабальны і стратэгічны парадак дня двухбаковы — Беларусі і Кітая».**

Яшчэ ў 2023 годзе Старшыня КНР Сі Цзіньпін прапанаваў больш актыўна прасоўваць сумеснае тэхналагічнае развіццё Беларусі і Кітая на аснове сучасных кітайскіх тэхналогій і беларускіх кампетэнцый у прамысловасці. Перш за ўсё ў машына-, трактара- і транспартным машынабудаванні. Па словах Мікалая Снапкова, з таго моманту гэта тэма вельмі актыўна развіваецца. У жніўні 2024-га Беларусь наведаў Прэм'ер Дзяржсавета КНР Лі Цян. Па выніках таго візіту быў падпісаны вялікі пакет пагадненняў і дамоўленасцяў у эканамічнай сферы. Былі падпісаны дакументы, якія вызначаюць канкрэтныя сумесныя праекты. «У нас заканчваецца Год навукі і тэхналогій. Наступны год — у нас будзе двухгодка, прысвечаная менавіта прамысловай кааперацыі. Таму сённяшняя сустрэча з'яўляецца стратэгічным пасылам на больш пашыранае, паглыбленае супрацоўніцтва з адным з вядучых сусветных вытворцаў цяжкай тэхнікі», — расказаў Мікалай Снапкоў.

Першы намеснік Прэм'ер-міністра звярнуў увагу, што адносіны Беларусі і Кітая паказваюць свету прыклад таго, як насамрэч трэба развівацца. «Тэзіс, які даўно прасоўваецца Кітайскай Народнай Рэспублікай у рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», на наш погляд, гэта не столькі эканамічны, колькі маральна-этычны тэзіс і шлях. І Беларусь ні на хвіліну, ні на год, ні на дзень не збочыла са шляху», — падкрэсліў ён. Мікалай Снапкоў нагадаў, што Беларусь адной з першых падтрымала ініцыятыву кітайскага лідара аб пабудове супольнасці адзінага лёсу чалавецтва. І гэтым, нават не эканамічным, а маральным шляхам Беларусь ідзе ўжо не першы год.

**«Таму сусветнай супольнасці трэба было б узяць прыклад з дружбы, узаемападтрымкі, сумеснага развіцця Беларусі і Кітая, што і дэманструе цяперашні візіт Прэзідэнта. Гэта не рабочы, не афіцыйны візіт. Гэта візіт для сямейнага сяброўскага абеду. Напэўна, і ў глабальным парадку не перашкодзіла б лідарам сусветных дзяржаў збірацца і размаўляць адзін з адным аб агульнай будучыні іх народаў», — адзначыў першы віцэ-прэм'ер.**

Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што нельга жыць у такіх умовах, якія склаліся ў сучасным свеце. «Трэба жыць у сумесным развіцці, на тым прыкладзе, які паказвае лідар Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Трэба жыць у міры з людзьмі дзеля сваіх народаў, іх росквіту. Іншых варыянтаў няма. У адваротным выпадку гэта вайна», — перакананы ён.

### ГЭТА АДКАЗ УСІМ, ХТО СПРАБУЕ З ДАПАМОГАЙ САНКЦЫЙ ЗНІШЧЫЦЬ БЕЛАРУСЬ



Супрацоўніцтва Кітая і Беларусі развіваецца па самых разнастайных кірунках. І за гэтыя гады геаграфічна далёкі Кітай стаў для нашай краіны вельмі блізкім. Як звярнула ўвагу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ірына ПЕТРУСЕВІЧ,** нашы краіны звязваюць не толькі ўсебаковае супрацоўніцтва, але сяброўства і ўзаемапавага. «Беларусь і Кітай актыўна працуюць над умацаваннем і развіццём сваіх дзелавых сувязяў, імкнучыся да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных сферах.

**Гэтыя адносіны, заснаваныя на прынцыпах дружбы і ўзаемнай павагі, дэманструюць устойлівы рост і адкрываюць новыя магчымасці для абедзвюх краін, — адзначыла сенатар.**

— Кітай — адзін з ключавых гандлёвых партнёраў Беларусі. Экспарт беларускай прадукцыі, такой, як прадукты харчавання, драўніна і калійныя ўгнаенні, у Кітай няўхільна расце. У сваю чаргу, і Беларусь імпартуе з Кітая шырокі спектр тавараў, уключаючы электроніку, абсталяванне і спажывецкія тавары. Кітайскія кампаніі актыўна інвестуюць у беларускую эканоміку, асабліва ў такія сектары, як лагістыка, прамысловасць і інфраструктура. Наша краіна адыгрывае важную ролю ў ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях», з'яўляючыся транзітным вузлом для грузаперавозак паміж Кітаем і Еўропай. Развіццё транспартнай інфраструктуры і лагістычных цэнтраў спрыяе павелічэнню тавараабароту і ўмацаванню эканамічных сувязяў». Ірына Петрусевіч выказала ўпэўненасць, што развіццё сяброўскіх і дзелавых адносін паміж Беларуссю і Кітаем будзе мацнець і далей.



**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Канстанцін СІРОЦІН** адзначыў, што візіт Аляксандра Лукашэнкі ў КНР — не проста чарговы дыпламатычны акт.

**«Гэта магутнае сведчанне ўнікальнай якасці беларуска-кітайскіх адносін, узнятых на беспрэцэдэнтную вышыню ўсепагоднага і ўсебаковага**

# І ВЫТВОРЧАСЦІ

## узаемападтрымкі, сумеснага развіцця Беларусі і Кітая



**стратэгічнага партнёрства дзякуючы асабістай волі і дальнабачнасці нашых лідараў — Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні Сі Цзіньпіна. Менавіта іх даверны дыялог і прамыя дамоўленасці выступаюць ключавым лакаматывам усяго спектра нашага ўзаемадзеяння — ад традыцыйна моцнай гандлёва-эканамічнай кааперацыі да перадавых сумесных праектаў у прамысловасці (БелАЗ, МАЗ, індустрыяльныя паркі), сельскай гаспадарцы і інавацыях», — сказаў ён.**

Канстанцін Сіроцін падкрэсліў, што цяпер краіны пераходзяць да новай якасці супрацоўніцтва, уключаючы пытанні бяспекі і процідзеяння выклікам сучаснасці. «Як дакладна адзначыў Прэзідэнт Беларусі: Беларусь і Кітай дэманструюць прыклад адносін, заснаваных на ўзаемным даверы, падтрымцы і шчырай дружбе. Гэты прынцып, закладзены лідарамі, з'яўляецца непарушным падмуркам нашага саюза. Ва ўмовах складанай міжнароднай абстаноўкі ўмацаванне сувязяў з надзейным стратэгічным партнёрам, якім з'яўляецца для нас Кітай, мае асаблівае значэнне. Візіт пацвярджае: Беларусь і Кітай — гэта саюзнікі, якія сумесна адстойваюць суверэнітэт і справядлівыя прынцыпы шматпалярнага свету. Сіла нашага партнёрства — у адзінстве мэт, глыбокім узаемаразуменні і цвёрдай волі лідараў абедзвюх краін», — канстатаваў сенатар.



**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Сяргей КЛІШЭВІЧ** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» звярнуў увагу на тое, што высокі ўзровень прыёму беларускага лідара, стаўленне кіраўніцтва звышдзяржавы сведчаць аб вялікай павазе да Беларусі. І, натуральна, аб даверы да нашай дзяржавы.

**«Мы выдатна разумеем, што ў Кітаі ўсе рашэнні пралічаныя, прапрацаваныя. Такога ўзроўню палітычныя рашэнні прымаюцца на перспектыву. Таму, вядома, калі мы бачым такое стаўленне да Беларусі, разумеем, што Кітай упэўнены ў нашай краіне, у яе стабільнасці, у тым, што сюды сапраўды можна інвеставаць, з палітычным кіраўніцтвам нашай дзяржавы можна мець справу, тут не будзе ніякіх сюрпрызаў і паваротаў на 180 градусаў ні ў 2030-м, ні ў 2035-м, ні ў 2040 гадах», — адзначыў ён.**

Сяргей Клішэвіч падкрэсліў, што статус усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва, які маюць адносіны Беларусі і Кітая, дарагога варты. «Гэта адказ усім тым, хто спрабуе з дапамогай санкцый націснуць на нас, знішчыць Беларусь. Наша супрацоўніцтва з Кітаем ператварае ў нуль любыя спробы эканамічна або тэхналагічна задушыць Беларусь», — падкрэсліў парламентарый. Па яго словах, вялікае значэнне маюць і цёплыя сяброўскія адносіны паміж Аляксандрам Лукашэнкам і Сі Цзіньпінам. Асабісты давер паміж лідарамі ён назваў асновай.

**«Улічваючы маштабы Кітая, ён мог бы шчыльна не супрацоўнічаць з такой краінай, як Беларусь, калі б не было палітычнага даверу. Таму ўзаемаадносіны лідараў дазваляюць нам сістэмна, паступальна развіваць кантакты па ўсіх кірунках», — адзначыў Сяргей Клішэвіч.**

Ён заўважыў, што розным краінам сёння не так проста дамагчыся таго, каб іх тавары трапілі на паліцы кітайскіх крам. Ідзе велізарная барацьба, сусветныя кампаніі прабіваюцца, каб хоць на нейкім месцы апынуцца ў Кітаі. А беларускія тавары без праблем там прадаюцца. Гэта, па словах парламентарыя, таксама было дасягнута дзякуючы шчыльнаму кантакту паміж лідарамі нашых дзяржаў, які дазваляе аператыўна дамаўляцца, вырашаць любыя пытанні ў інтарэсах краін. «Таму і вынік такі: санкцыі, якія супраць нас уводзяць, разбіваюцца аб нашы брацкія стасункі з такімі дзяржавамі, як Кітай, Расія, іншымі краінамі, куды мы можам пастаўляць сваю прадукцыю. Адпаведна, развіваючы такім чынам нашу прамысловасць і ўмацоўваючы беларускі суверэнітэт і незалежнасць. Гэта велізарная карысць для простага беларуса», — падсумаваў Сяргей Клішэвіч.



На сапраўды сяброўскія адносіны лідараў дзвюх краін, якія з'яўляюцца лакаматывам міждзяржаўных адносін, звярнуў увагу ў эфіры Першага нацыянальнага і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Дзмітрый ШАЎЦОЎ.** «Для нас Кітай — не проста краіна, а надзейны партнёр, — адзначыў ён. — Гэта дзяржава, зацікаўленая ў развіцці сучасных тэхналогій на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Кітай — нібы старэйшы брат, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. І шмат гадоў мы гэта бачым. Адносіны лідараў дзвюх краін пацвярджаюць гэта.

**Нават той факт, што пасля прыбыцця і такой ганаровай, насамрэч вельмі ганаровай, высокай сустрэчы нашага Прэзідэнта адбылася сямейная сустрэча, сведчыць аб тым, наколькі Кітай прыхільны не толькі да Беларусі, але і, самае галоўнае, да яе лідара — Аляксандра Рыгоравіча. Тым больш для кітайцаў такія жэсты маюць вялікае значэнне...»**

## КІТАЙСКІЯ КАМПАНІІ ПАВЯЛІЧЫЛІ ПРОДАЖ ТАВАРАЎ НА ТАРГАХ БУТБ

Прэзідэнт часта нагадвае пра тое, што ў аснове сяброўства — эканоміка. Эканамічныя адносіны Кітая і Беларусі развіваюцца імкліва і плённа. Свежы прыклад прыйшоў ад прэс-службы Беларускай універсальнай таварнай біржы. Там паведамілі, што кітайскія вытворцы значна павялічылі аб'ёмы продажаў прамысловага абсталявання, электронікі, інструментаў, запчастак і камплектуючых для машын і тэхнікі на таргах БУТБ. За пяць месяцаў 2025 года агульная сума здзелак па рэалізацыі гэтых відаў тавараў дасягнула 2 мільёнаў долараў, што ў 11 разоў больш, чым за аналагічны перыяд 2024-га. Высокі тэмп росту звязаны з пашырэннем наменклатуры прадукцыі прамысловага прызначэння, якую рэзідэнты Кітая пастаўляюць у Беларусь праз біржавую пляцоўку: сёлета гэта каля 40 таварных пазіцый, тады як у студзені — маі мінулага года іх было менш за 10. «У гэтым годзе акрэдытаваныя на біржы кітайскія пастаўшчыкі сталі нашмат больш актыўна рэагаваць на заяўкі на куплю тавараў для прамысловасці, якія размяшчаюць беларускія прадпрыемствы, — адзначылі ў прэс-службе БУТБ. — У выніку ў разы вырасла не толькі сума здзелак, але і пералік таварных пазіцый, уцягнутых ва ўзаемны біржавы гандаль. Цяпер у Кітаі праз БУТБ набываюцца і камплектуючыя для тэхналагічнага абсталявання, і кантрольна-вымяральныя прыборы, і электронныя кампаненты для вытворчых ліній, і запасныя часткі для прамысловага інструмента».

Сярод найбольш цікавых здзелак у прэс-службе таварнай біржы выдзелілі закупку абсталявання для зарадкі электрамабіляў, а літаральна ў канцы мінулага тыдня была заключана першая здзелка па куплі прамысловага робата. Такім чынам, доля рэзідэнтаў Кітая ў біржавых пастаўках прамысловай прадукцыі на беларускі рынак паступова павялічваецца. На сёння гэта ўжо 9 % супраць 2 % у студзені — маі 2024 года. Па стане на 2 чэрвеня на БУТБ былі акрэдытаваны 280 рэзідэнтаў Кітая, у тым ліку чатыры біржавыя брокеры. З пачатку года ўдзельнічаць у біржавых таргах пачалі 33 новыя кампаніі з Паднябеснай.

**Падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**



# КАЛІ АДЛЕГЛАСЦЬ НЕ ПЕРАШКОДА

## Беларусь зацікаўлена развіваць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва з Прыморскім краем

Аб гэтым заявіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас сустрэчы з губернатарам Прыморскага краю Расійскай Федэрацыі Алегам КАЖАМЯКАМ.

«Паміж Беларуссю і Прыморскім краем склаліся добрыя і сяброўскія адносіны. Наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч даволі часта сустракаецца з вамі і гаворыць заўсёды аб тым, што Прыморскі край, нягледзячы на далёкасць, — гэта наша зямля. Мы разумеем, што там жывуць нашы добрыя сябры, браты, — адзначыла Наталля Качанава. — Разумеем, што нам трэба далей узаемадзейнічаць і ўзаемадзеянне гэта можа быць абсалютна па ўсіх кірунках. Але для нас надзвычай важнае рэгіянальнае супрацоўніцтва. Наш Прэзідэнт надае гэтаму вельмі сур'ёзнае значэнне. Толькі за мінулы год 36 дэлегацый на чале з губернатарамі Расійскай Федэрацыі наведалі нашу краіну, і заўсёды Аляксандр Рыгоравіч сустракаецца з імі».

Спікер падкрэсліла, што для Савета Рэспублікі, які з'яўляецца органам тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, міжрэгіянальнае супрацоўніцтва вельмі важнае. «Мы надаём асаблівае значэнне гэтаму кірунку ў сваёй дзейнасці, — сказала Наталля Качанава. — Цяпер рыхтуемся да Форуму рэгіёнаў. Сёлета мы будзем праводзіць XII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Ніжнім Ноўгарадзе. Ужо 77 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі заявіліся для ўдзелу ў ім, а з нашага боку абсалютна ўсе вобласці будуць удзельнічаць. Таму мы шчыра будзем рады сустрэчы з вамі на палях форуму. Я думаю, што мы прырасцём новымі кантрактамі, пагадненнямі, бо разумеем, што гэта на карысць нашых народаў і нашых краін».

**«Я думаю, што нам трэба і з заканадаўчай уладай больш працаваць, — заўважыла спікер Савета Рэспублікі. — Супрацоўніцтва парламентарыяў на сучасным этапе вельмі важнае, калі народныя прадстаўнікі кантактуюць, і на многіх міжнародных пляцоўках мы гаворым праўду, — гэта дарагога варта. Заўсёды будзем рабіць усё для таго, каб прынятыя рашэнні і дамоўленасці, якія былі дасягнуты на вышэйшым узроўні, нашымі ўрадамі, кіраўніцтвам абласцей, рэгіёнаў, — выконваліся.**

Мы павінны працаваць так, каб гэта было эканамічна выгадна для нашых краін і, вядома, рэзультатыўна. Таму мы ў любым выпадку падключаемся да вырашэння ўсіх пытанняў і задач, якія ставіць перад намі Прэзідэнт краіны. Вы можаце заўжды разлічваць на нас для таго, каб добрыя адносіны паміж Беларуссю і Прыморскім краем прадаўжалі таксама дынамічна развівацца. Я ўпэўнена, што так і будзе».

У сваю чаргу Алег Кажамяка выказаў зацікаўленасць у пастаўках беларускіх прадуктаў харчавання, якія вызначаюцца высокай якасцю і падабаюцца жыхарам Прымор'я, а таксама сельскагаспадарчай, камунальнай, аўтадарожнай тэхнікі. З Далёкага Усходу ў нашу краіну пастаўляецца борная кіслата, рыба і морапрадукты, разглядаецца павелічэнне аб'ёмаў паставак рыбнай мукі.

«Дынаміка ў прамысловасці, у пастаўках сельгаспрадукцыі ў нас ёсць, — адзначыў губернатар. — Я магу заўважыць да гонару, што сёння вельмі шмат сустрэў землякоў з Амурскай вобласці, Сахаліна, якія прыехалі на выстаўку «Белагра». Прыехалі прадстаўнікі з Прыморскага краю. Вельмі цікавая тэхніка, сёння мы глядзелі новыя энерганасычаныя трактары. Гэта такі сур'ёзны прарыў, дастаткова сур'ёзны крок у частцы імпартазамяшчэння».

«Жыхары Прымор'я ў многім каранямі звязаны з Беларуссю і з павагай ставяцца да вашай краіны», — падкрэсліў Алег Кажамяка.

**Паводле БелТА.**

# НАША ВАЖКАЕ Ў ХАРЧОВАЙ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта выстаўка «Белагра» — адна з самых буйных і знакавых падзей у АПК нашай краіны. Яна з'яўляецца не толькі пляцоўкай для дэманстрацыі дасягненняў, але і ўнікальнай магчымасцю абмяняцца вопытам, наладзіць новыя дзелавыя кантакты і ўмацаваць існуючыя сувязі. Тут прадстаўлены найлепшы айчынны і міжнародны вопыт у галіне аграпрамысловага машынабудавання, харчовай і перапрацоўчай прамысловасці. Дарэчы, сёлета ў выстаўцы бяруць удзел 545 кампаній з 14 дзяржаў. Расія, Кітай, Іран, В'етнам, Казахстан і не толькі — геаграфія краін, зацікаўленых у супрацоўніцтве з аграрным сектарам Беларусі, даволі шырокая.



## МАШТАБЫ РАСТУЦЬ, ТЭХНІКА ЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА

**Намеснік Прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА** падчас старту Беларускага аграпрамысловага тыдня адзначыў, што «Белагра» з году ў год дынамічна развіваецца і становіцца ўсё больш вядомай у свеце: «Маштабы выстаўкі растуць, колькасць удзельнікаў павялічваецца кожны год. Сёння тут прадстаўлена звыш 550 павільёнаў і экспазіцый, сярод якіх экспанаты вядучых расійскіх рэгіёнаў, краін — удзельніц Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Асабліва радуе пашырэнне геаграфіі нашых партнёраў: прадукцыя, прадстаўленая на выстаўцы, запатрабаваная больш чым у 100 дзяржавах планеты, уключаючы Афрыку і Азію».

Гаворачы аб развіцці сельскай гаспадаркі, Юрый Шулейка вылучыў ролю айчыннага машынабудавання, без якога немагчыма ўявіць увесь ланцужок вытворчасці, пачынаючы ад тэхнікі і заканчваючы канчатковым прадуктам на стале спажыўца: «Менавіта дзякуючы сумеснай рабоце розных галін эканомікі забяспечваецца харчовая незалежнасць краіны і далейшы экспарт прадуктаў харчавання».

**Намеснік Прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ** у размове з журналістамі падкрэсліў: «Напэўна, складана сёння ўявіць развіццё аграпрамысловага комплексу без выкарыстання эфектыўнай сучаснай тэхнікі, абсталявання, механізмаў. Дзякуючы падтрымцы кіраўніка дзяржавы сельгасмашынабудаванне і ў цэлым аграпрамысловы комплекс дынамічна развіваюцца. Гэта дае вынікі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, яе рэалізацыі на ўнутраным рынку і павелічэнні аб'ёмаў яе паставак на экспарт».

На выстаўцы прадэманстраваны шырокі асартымент тых тэхнікі, абсталявання, механізмаў, якія ўжо добра сябе зарэкамендавалі, а таксама новыя ўзоры. «Тут ёсць і ўсім вядомыя збожжа- і кормаўборачныя камбайны вытворчасці «Гомсельмаш». Гэта і тэхніка МТЗ, і прычапное, навясное абсталяванне вытворчасці «Бабруйскаграмаша», «Лідсельмаша» і іншых беларускіх вытворцаў. Форум дае магчымасць паказваць, наколькі дынамічна развіваецца наша сельгасмашынабудаванне», — расказаў віцэ-прэм'ер.

Сярод новых узораў тэхнікі — пяцісотсільны трактар МТЗ, які цяпер праходзіць выпрабаванні і ў хуткім часе будзе працаваць на беларускіх палях.

Па словах Віктара Каранкевіча, вельмі шмат зроблена ў рамках імпартазамяшчэння — камплектуючыя, вузлы і агрэгаты ўжо беларускай вытворчасці. «У нас дастаткова высокі ўзровень сумеснай кааперацыі з расійскімі калегамі, — сказаў ён. — На пляцоўцы «Белагра» можна таксама паказаць, наколькі павышаны наш тэхналагічны суверэнітэт і асвоены новыя кампетэнцыі ў беларускім сельгасмашынабудаванні».

## ВАЖНАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

**Намеснік генеральнага сакратара Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Джанеш КЕЙН** звярнуў увагу на тое, што свет сутыкаецца з комплекснымі праблемамі. Адна з іх — харчовая бяспека, у забеспячэнні якой Беларусь адыгрывае важную ролю. У нашай краіне займаюцца вытворчасцю ў тым ліку тэхнікі, угнаенняў. Краіны — члены Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў сваю чаргу з'яўляюцца аднымі з найбуйнейшых сусветных



# СЛОВА БЯСПЕЦЫ

вытворцаў і спажыўцоў аграрнай прадукцыі. «Таму такі форум — вельмі своечасовы, гэта пляцоўка для абмену меркаваннямі, вопытам, абагульнення работы», — дадаў Джанеш Кейн.

Сярод удзельнікаў «Белагра» шмат прадстаўнікоў расійскіх рэгіёнаў. **Кіраўнік прадстаўніцтва Ніжагародскай вобласці ў Беларусі Андрэй ДУДКІН** адзначыў, што галоўная задача ўдзельнікаў аграпрамысловага форуму — пашырэнне гандлёва-эканамічных узаемаадносін: «З улікам плённых шматгадовых сувязяў паміж прамысловасцю і эканомікай нашага рэгіёна і Беларусі мы спадзяёмся на больш глыбокія ўзаемаадносіны — кааперацыйныя, інтэграцыйныя сувязі, выйсці на стварэнне сумесных прадпрыемстваў, прадуктаў».

Па словах Андрэя Дудкіна, ужо ўдалося дамовіцца аб шэрагу сустрэч: «Днямі ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры адбудуцца перагаворы з прадстаўнікамі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў. Гэта вельмі важная пляцоўка для перагаворнага працэсу паміж прафесіяналамі».

Шматлікія кампаніі хочуць супрацоўнічаць з Беларуссю, адзначыла **кіраўнік Цэнтра падтрымкі экспарту Ніжагародскай вобласці Аляксандра БЯССОНАВА**: «Ніжагародская вобласць — прамысловы рэгіён. Для нас вельмі цікава ўсё, што адносіцца да прамысловасці, машынабудавання, хімічныя праекты. Вядома, інтарэс выклікаюць сумесныя з Беларуссю праекты для продажу за межы Саюзнай дзяржавы. Цікавасць да вашай краіны не згасае: сяброўскія адносіны з боку партнёраў, падобная мова, менталітэт — вельмі важныя складнікі для бізнесменаў».

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота БелТА і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**






## Дарэчы

### БУЛЬБЫ ХОПІЦЬ УСІМ

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый ГОРЛАЎ** на адкрыцці «Белагра-2025» падчас размовы з журналістамі закрануў надзённае пытанне — наяўнасць бульбы новага ўраджаю. Яна, па словах міністра, з'явіцца на прылаўках ужо ў найбліжэйшыя тыдні: «У мінулым годзе сельгасарганізацыі краіны вырасцілі каля 780 тысяч тон бульбы. Патрэбы нашай краіны — гэта 78—90 тысяч тон бульбы ў год. Астатняе мы экспартуем. Па нашых разліках, мы можам замясціць той аб'ём бульбы, які імпартуе Расійская Федэрацыя ў сваю краіну. Сёлета зрабілі на гэта вялікую стаўку, але гэта яшчэ не мяжа», — адзначыў Юрый Горлаў. Да ведама, у 2024 годзе ў гаспадарках усіх катэгорый было накапана 3,1 мільёна тон бульбы.

«Сёлета беларускія аграрыі высадзілі бульбу на плошчы 21 тысяча гектараў. З улікам фермераў, якія займаюцца вырошчваннем бульбы, мы плануем атрымаць каля 1 мільёна тон бульбы. Яе хопіць як для ўнутранага спажывання, так і на рэалізацыю», — падкрэсліў міністр.

Прывазная бульба на паліцах беларускіх крам займае невялікі працэнт, дадаў ён. «У нас дастаткова нашай беларускай бульбы, ранняй бульбы, якую мы высадзілі ў красавіку. Надвор'е ўнесла невялікія карэктывы. З-за замаразкаў вегетацыя вялася не такімі тэмпамі, як фізіялагічна павінна было быць. Таму мы цяпер чакаем і прыступаем да ўборкі беларускай бульбы, якая задаволіць патрэбы ўсяго нашага ўнутранага рынку», — звярнуў увагу кіраўнік галіны і заявіў, што бульба новага ўраджаю з'явіцца на прылаўках ужо ў найбліжэйшыя тыдні.

Сельскагаспадарчыя арганізацыі павінны былі да 1 чэрвеня завяршыць работы па ліквідацыі наступстваў вясновых замаразкаў. «Мы з гэтай задачай справіліся. Што датычыцца ў цэлым агародніны — бульбы, морквы, цыбулі, капусты, то ў нас яе будзе дастатковая колькасць. Адзінае пытанне толькі па пладовых культурах з-за замаразкаў — гэта яблыкі. У чэрвені будзем глядзець, які ўраджай плануецца атрымаць сёлета, і прымем рашэнне аб тым, ці трэба дадаткова іх завозіць», — сказаў Юрый Горлаў.


**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Бобруйский завод КПД» на праве собственности**

**Аукцион состоится 19.06.2025 в 12.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

**Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77090,** пл. – 1 423,2 кв. м, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002357 (пл. – 0,2551 га, право аренды) по адресу: г. Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 1А.
**Начальная цена продажи: 291 600,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 29 160,00 бел. руб.**

**Лот № 2. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77093**, пл. – 279,9 кв. м, с цокольным этажом, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002359 (пл. – 0,0893 га, право аренды) по адресу: Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 3А.
**Начальная цена продажи: 61 800,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 6 180,00 бел. руб.**

**Лот № 3. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77096**, пл. – 234,2 кв. м, с цокольным этажом, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002361 (пл. – 0,0969 га, право аренды) по адресу: г. Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 5А.
**Начальная цена продажи: 58 800,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 5 880,00 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа: РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: **по 18.06.2025 до 11.00.**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Продавец: ОАО «Бобруйский завод КПД», УНП 700016179, Могилёвская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 130.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64)
по поручению **Государственного учреждения «Молодечненского межотраслевого центра обеспечения деятельности бюджетных организаций»**
(222310, г. Молодечно, ул. Я. Ясинского, 21)
в интересах **««Специализированной детско-юношеской школы олимпийского резерва № 2 Молодечненского районного исполнительного комитета»»**
проводит повторный открытый аукцион
по продаже **прицепа специального фургона ДЕБОН VAN 2000** (инв. № 015400001), 2008 г. в.,
**кузов № SY920040008DE1814, рег. знак 4734 АА-5, цвет – бело-зеленый, находящегося по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Ясинского, 21.**

**Начальная цена** (без НДС) – **7 850,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **785,00** бел. руб.

**Стоимость снижена на 50 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 02.04.2025.

Электронные торги состоятся **20.06.2025** в **10.00**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.06.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра транспорта (8029) 322-68-85, время осмотра с 9.00 до 16.00 понедельник – пятница.**

УНП 692245892



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Оптово-логистический центр «БелТекс»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 18.06.2025.**

**Лот № 1:**
Г 1/К ЗДАНИЕ МАГАЗИНА «НЕЛЛИ»
с инв. № 500/С-3583, площадь: 461,0 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 32.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 507 000,00 руб.
Задаток – 150 700,00 руб.
Обременения: договоры аренды.

Капитальное строение с инв. № 500/С-3583 расположено на земельном участке 500000000009001893, площадь: 0,4819 га.

Право постоянного пользования. Доля: 1/1.

На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **16.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ І ГРУЗАВЫЯ БЕСПІЛОТНІКІ

## На ЕЭФ-2025 у Мінску краіны ЕАЭС абмяркуюць развіццё транспарту і яго лічбавізацыю

26 чэрвеня ў Мінску на пляцоўцы IV Еўразійскага эканамічнага форуму пройдуць дзве тэматычныя сесіі, прысвечаныя пытанням развіцця інтэграцыі ў сферы транспарту, паведамілі ў прэс-службе ЕЭК.



У рамках сесіі «Устойлівы транспарт у Еўразійскім рэгіёне: мабільнасць, мультымадальнасць і лічбавізацыя» з удзелам міністра па энергетыцы і інфраструктуры ЕЭК Арзыбека Кажошава абмяркуюць рэгіянальныя меры па падтрыманні ўстойлівых транспартных зносін, звязальнасці тэрыторый і мабільнасці; магчымасці спалучэння інтэграцыйных працэсаў у сферы транспарту ў рамках партнёрства ЕАЭС, СНД, ШАС, ЭСКАЦА і ЕЭК ААН; механізмы рэгіянальнага і міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння па развіцці міжнародных транспартных калідораў. Таксама ў цэнтры ўвагі апынуцца магчымасці рэалізацыі сумесных інфраструктурных праектаў; мультыплікатыўны эфект развіцця мультымадальных і кантэйнерных перавозак грузаў; далейшае развіццё працэсу кантэйнерызацыі грузаў у ЕАЭС і новая парадыгма развіцця міжнародных перавозак на фоне змяненняў у макраэканоміцы.

Як адзначылі арганізатары, у панэльнай сесіі возьмуць удзел кіраўнікі дзяржорганаў краін ЕАЭС, міжнародных арганізацый, міжнародных інстытутаў развіцця.

Што датычыцца панэльнай сесіі «Укараненне лічбавых рашэнняў на транспарце ў ЕАЭС: беспаперовыя тэхналогіі, аўтаматызаваныя і беспілотныя транспартныя сродкі», удзельнікі абмяняюцца вопытам прасоўвання такіх трэндаў лічбавага парадку дня, як лічбавая трансфармацыя і развіццё беспаперовых тэхналогій; інтэлектуальныя транспартныя сістэмы і беспілотныя транспартныя сродкі. Тэмамі для абмеркавання таксама стануць аўтаматызаваныя транспартныя сродкі; укараненне лічбавых рашэнняў на транспарце ў рамках ЕАЭС на прыкладзе электроннай таварна-транспартнай накладной пры міжнародных перавозках.

Дарэчы, беспілотны грузавы транспарт — гэта рэаліі бягучага дня, якія дазваляюць павысіць эфектыўнасць лагістыкі і знізіць рызыку аварыйных сітуацый. З кожным днём з'яўляецца ўсё больш канцэптаў і ўжо гатовых беспілотных апаратаў, новых сэрвісаў. Штучны інтэлект усё больш актыўна ўкараняецца ў працэсы транспарціроўкі і забяспечвае функцыянаванне сучаснай інфраструктуры. Усе гэтыя новаўвядзенні робяць наша жыццё больш бяспечным і камфортным.

Арганізатары выказалі ўпэўненасць, што ў рамках панэльнай сесіі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, міжнародных арганізацый, інстытутаў развіцця, навуковых і экспертных колаў абмяркуюць гэтыя пытанні, а таксама актуальныя кірункі лічбавізацыі ў сферы транспарту.

# СВАЕ «МЕТРЫ» ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

## З 1 чэрвеня ўступілі ў сілу ўказы, накіраваныя на ўдасканаленне падыходаў да парадку будаўніцтва і крэдытавання жылля

Як расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры Іна ПІНКОЎСКАЯ, галоўная мэта Указа № 95 «Аб дзяржаўнай падтрымцы пры жыллёвым будаўніцтве» заключаецца ў стварэнні агульнага ўсёабдымнага дакумента па аказанні грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры паляпшэнні жыллёвых умоў.

Ён прадугледжвае тры формы дзяржпадтрымкі пры будаўніцтве або набыцці жылля.

Спецыяліст адзначыла, што 21 катэгорыя грамадзян можа прэтэндаваць на льготныя крэдыты на будаўніцтва аднакватэрных жылых дамоў, кватэр у блакіраваных жылых дамах, а таксама на набыццё аднакватэрных жылых дамоў, кватэр у шматкватэрных або блакіраваных жылых дамах, пабудаваных па дзяржзаказе.

Аднаразовыя субсідыі на будаўніцтва або набыццё жылля даступныя 17 катэгорыям грамадзян.

Фінансавая дапамога дзяржавы ў вяртанні запазычанасці па льготных крэдытах выдзяляецца шматдзетным і маладым сем'ям пры нараджэнні дзяцей.

У населеных пунктах да 20 тысяч чалавек ільготныя крэдыты даюцца для куплі жылля як на першасным рынку (пабудаванага па дзяржаўным заказе), так і на другасным.

У той жа час Указам № 94 у новай рэдакцыі выкладаецца раней дзеючы № 215, якім уведзены механізм дзяржаўнага заказу на будаўніцтва жылля.



— Сутнасць дзяржзаказу заключаецца ў тым, што ўзвядзенне жылых дамоў вядзецца дзяржзаказчыкамі (УКБ і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі) без прыцягнення грамадзян на этапе будаўніцтва. Льготны крэдыт на будаўніцтва жылога дома даецца арганізацыі-заказчыку. Пасля ўводу дома ў эксплуатацыю і заключэння дагавораў куплі-продажу з грамадзянамі запазычанасць па льготных крэдытах пераафармляецца на грамадзян, — патлумачыла Іна Пінкоўская.

Яна запэўніла, што на тэмпах будаўніцтва жылля гэта ніяк не адаб'ецца:

— Проста шматкватэрныя жылыя дамы, якія раней узводзіліся па долевых дагаворах або ў складзе жыллёва-будаўнічых спажывецкіх кааператываў, пераводзяцца на будаўніцтва па дзяржзаказе. Такі спосаб больш прымальны для грамадзян, бо з гэтага часу яны не сутыкнуцца з пераносамі тэрмінаў уводу жылля ў эксплуатацыю або змяненнем кошту кватэры ў працэсе яе будаўніцтва, адпаведна, адпадзе неабходнасць браць крэдыт падчас будоўлі. Пасля завяршэння будаўніцтва заказчык атрымае цалкам гатовую для пражывання кватэру. Ніякіх праблем не ўзнікне дакладна.

Дарэчы, указ прадугледжвае магчымасць будаўніцтва ў шматкватэрным жылым доме часткі кватэр па дзяржаўным заказе і часткі кватэр за кошт сродкаў бюджэту для выдзялення грамадзянам у якасці арэнднага і сацыяльнага жылля.

У ліку падрыхтаваных навацый таксама — продаж жылля, пабудаванага па дзяржзаказе, усім грамадзянам, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, тады як цяпер — толькі тым, якія маюць права на дзяржпадтрымку.

Усе змены ўступілі ў сілу з 1 чэрвеня 2025 года. Дзяржаўная падтрымка па жылых дамах, узвядзенне якіх пачалося да названай даты, будзе весціся на ранейшых умовах.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АСБ Лизинг» (филиал «АСБ Логистик») 202128, Минская область, Воложинский район, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77. УНП 601082389 |

**Предмет электронных торгов – складская техника (б/у)**
**Местонахождение –**
**Минская обл., аг. Раков, ул. Радошковичская, 77**

| № лота | Наименование | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Электрический перевозчик паллет BT LWE 160 levio 1753-2, 2012 г. в. № 6224065 (04007) | 956,00 |
| 2 | Электрический перевозчик паллет BT LWE 160 levio, 2012 г. в. № 6189902 (3001) | 956,00 |
| 3 | Электрический перевозчик паллет BT LWE 160 levio, серийный (зав) № 6212099 2012 г. | 956,00 |
| 4 | Электротележка BT LWE 200 1753-120, 2011 г. в. № 6219304 (03928) | 1 220,00 |
| 5 | Электроштабелер «Ричтрак» BT RRE 140M Reflex 1753-5, 2012 г. в. № 6220176 (03952) | 3 958,00 |
| 6 | Электроштабелер «Ричтрак» BT RRE 140M Reflex 1753-5, 2012 г. в. № 6220401 (03958) | 3 958,00 |
| 7 | Электроштабелер «Ричтрак» BT RRE 140M Reflex 1753-84, 2012 г. в. № 6219305 (03934) | 5 076,00 |
| 8 | Электроштабелер «Ричтрак» BT RRE 140M Reflex 1753-84, 2012 г. в. № 6219306 (03936) | 3 958,00 |
| 9 | Электрическая тележка BT LWE 160, серийный (заводской) № 6212105 | 1 169,00 |
| 10 | Электроштабелер «Ричтрак» BT REFLEX RRE 140M Reflex 1753-5, серийный (заводской) № 6216431 | 4 240,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 06.05.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**:
**18.06.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Гражданин РБ Роговский Виталий Валентинович |

**Предмет электронных торгов** –
Объекты недвижимого имущества в количестве 3 ед., общ. пл. **2227 кв. м,** реализуемые одним лотом по адресу:
***Витебская обл., г. Браслав, ул. Промышленная, 13, 13/11, 13/6***

Сведения о земельных участках: три участка предоставлены на праве аренды (срок действия по 08.10.2122) пл. 0,5208 га, 0,1709 га, 0,0587 га.
Состав имущества размещен на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Начальная цена, без НДС – 180 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**:
**18.06.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
4 чэрвеня 2025 г. № 20 (801)



# ЧЫСТА ПА-ЧАЛАВЕЧЫ

## Як даць рады стыхійным сметнікам на мясцовым узроўні

Год добраўпарадкавання

Надышоў сезон, пачалі грамадзяне наводзіць парадак на вясковых сядзібах і лецішчах — і расквітнелі на ўзлесках каля вёсак і садовых таварыстваў... стыхійныя звалкі. На нядаўняй нарадзе па абыходжанні з адходамі Прэзідэнт звярнуў на гэта асаблівую ўвагу: «Што там робіцца — кашмар. Прама на ўскрайку лесу, ніхто асабліва не турбуецца: заехаў самазвал — выкінулі. Чаго толькі няма! Я спецыяльна спыніўся, паглядзеў: старыя халадзільнікі, пластмаса, шкло, рознае бытавое смецце...» Гэта кіраўнік дзяржавы расказаў пра свае назіранні ў Мінскім раёне. Можна толькі ўявіць, што робіцца далей ад сталіцы. Праблема існуе, яна надзённая і патрабуе вырашэння. Не толькі таму, што ідзе Год добраўпарадкавання ў краіне, брэндам якой стала чысціня, але і таму, што другасныя рэсурсы, такія запатрабаваныя ва ўсім свеце, закопваюцца ў зямлю ці зарастаюць хмызняком.
Праблема, канешне, узроўню краіны, але вырашэнне яе, як, бадай, ніякай іншай, залежыць ад улады мясцовай. Нашы карэспандэнты ў рэгіёнах пацікавіліся, як змагаюцца са стыхійнымі звалкамі ў асобных сельсаветах.



### КАНТЭЙНЕРЫ ЯК ВЫРАТАВАННЕ

Праблема стыхійных звалак у ваколіцах населеных пунктаў дакладна не мінула ніводзін сельсавет. За гады работы давялося сустракацца з рознымі спосабамі вырашэння: ад самых арыгінальных, якія выліваліся ў цэлыя акцыі-праекты, да банальных — узяў пакет і сабраў наступствы чужога бескультур'я. Больш за дзесяцігоддзе таму, напрыклад, давялося пісаць, як у Жабінкаўскім раёне Брэстчыны ліквідавалі такога сметніка, ініцыяваная райінспекцыяй аховы навакольнага асяроддзя, ператварылася ў добраўпарадкаванне маляўнічага кутка прыроды і ўладкаванне невялікай зоны адпачынку.

Тагачасны начальнік раённай інспекцыі Сяргей Штык з калегамі заехалі на тэрыторыю заказніка мясцовага значэння, па сваёй завядзёнцы сабралі ў мех смецце каля вогнішча, а потым выпадкова заўважылі рэшткі камянёў-надмагілляў. Прыцягнулі краязнаўцаў, высветлілі, што тут некалі была сядзіба памешчыкаў Райскіх з пабудовамі, капліцай, нават сямейнымі могілкамі. На заклік адгукнуліся будаўнікі і спецыялісты ЖКГ, прадстаўнікі грамадскасці. Правялі некалькі суботнікаў, расчысцілі і добраўпарадкавалі мясціну на беразе ракі, у выніку чаго з'явіўся прыгожы, маляўнічы куток. Побач паставілі кантэйнер для збору смецця.

Менавіта кантэйнер лічыць галоўным складнікам вырашэння праблемы **старшыня Ружанскага сельскага Савета Пружанскага раёна Аксана ЮРКОЎСКАЯ**.

— За чысціню ў пасёлку мы змагаемся ўсімі даступнымі спосабамі. Намаганні праспяховыя. Скажам, па выніках конкурсу сярод сельсаветаў у 2020 годзе атрымалі прэмію. За гэтыя грошы набылі 18 кантэйнераў, устанавілі на розных вуліцах. І пасля зімы 2020—2021 года адразу адчулі паляпшэнне санітарнага стану. Варта сказаць, што вялікае значэнне надаём асветніцкай, прапагандысцкай рабоце. За чысціню і парадак мы агітуем у сацыяльных сетках, на сельскіх сходах, разам з моладдзю ладзім флэш-мобы, ствараем наглядную агітацыю.

— Летась, дарэчы, набылі і паставілі яшчэ 15 кантэйнераў у Ружанах, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. — А цяпер на ініцыятыве прадпрыемства «Камунальнік» людзі набываюць і ўстанаўліваюць на падворках індывідуальныя пластыкавыя кантэйнеры аб'ёмам на 100 літраў. Гэта вельмі зручна: у вызначаны дзень гаспадар выкочвае кантэйнер на вуліцу, пад'язджае смеццявоз, выгружае змесціва, затым кантэйнер вяртаецца на падворак. Жыхары ўжо заказалі першую партыю — 9 такіх кантэйнераў. Думаю, іх суседзі возьмуць прыклад.

— Ну, а невялікія, нават не звалкі, выпадковыя кучкі смецця, якія знаходзім вясной, прыбіраем на суботніках, — прыгадала Аксана Юркоўская.

### НАВОШТА Ў ЛЕСЕ КАНАПА?

Спецаўтатранспарт Горацкага «Камунальніка» па вывазе бытавых адходаў ад насельніцтва наведвае населеныя пункты Рэцянскага сельсавета раз на тыдзень, а там, дзе жыхароў зусім мала, — па меры неабходнасці, але не радзей, чым раз на два тыдні. Нічога не перашкаджае жыхарам культурна вырашыць праблему са смеццем, але стыхійныя звалкі ўсё ж перыядычна ўзнікаюць то тут, то там. Асабліва іх шмат у ваколіцах вёсак вясной і восенню.

— Не хапае нам сістэмы відэаназірання, працей было б знайсці парушальнікаў, — уздыхае **старшыня Рэцянскага сельсавета Горацкага раёна Магілёўскай вобласці Наталля ШЧУРЭВІЧ**. — Робім абход домаўладанняў, вядзём з людзьмі тлумачальную работу, але не да ўсіх інфармацыя даходзіць. Часам здараюцца абсурдныя сітуацыі. Жыхары выносяць за межы сваёй тэрыторыі раслінныя адходы і нават галлё. Аргументуюць, што за спальванне МНС можа пакараць.

Найбольш востра стаіць праблема з утылізацыяй старой мэблі, груваздкай бытавой тэхнікі, будаўнічых адходаў. Каб пералічанае вывезці, чалавек павінен заказаць у камунальнікаў кантэйнер, а гэта каштуе каля двухсот рублёў. Ахвотных несці такія выдаткі няма, нават калі суму падзяліць на некалькіх чалавек. Таму не факт, што чыясьці старая канапа аднойчы не апынецца дзесьці на ўскрайку лесу.

— Калі нам становіцца вядома, што нехта вязе «хаваць» смецце, адразу ж рэагуем, — кажа дэпутат. — Былі выпадкі, калі затрымлівалі чалавека, як той казаў, на месцы злачынства. Рабілі здымкі, выклікалі санстанцыю.

На думку дэпутата, нядобрасумленнага грамадзяніна адным толькі прадпісаннем не напужаеш. Прыпыніць яго можа толькі пакаранне рублём. Але, каб скласці пратакол, трэба сабраць шмат дакументаў, ды яшчэ і сведак знайсці. А дзе іх узяць, калі ўсё робіцца ўпотай?

На вёсцы карэннага насельніцтва становіцца ўсё менш, у асноўным прыязджаюць дачнікі. Яны наогул да графікаў вывазу адходаў не вельмі прывязваюцца. Робяць, як ім зручна.

У выніку на ліквідацыю стыхійных звалак ідуць дадатковыя грошы і сілы. І часцей за ўсё тут памочнікі — прадпрыемствы, з якімі сельсавет супрацоўнічае. Рэцянскаму сельсавету істотна дапамагаюць мясцовыя гаспадаркі ААТ «Горацкае» і ААТ «Горкілён».

У Горскім сельсавеце знайшлі свой спосаб барацьбы са стыхійнымі звалкамі. І дапамагаюць у гэтым вучні Горскай сярэдняй школы. — Як адзначае **старшыня Горскага сельсавета Вячаслаў ЛЕАНОВІЧ**, перыядычна яны разам выязджаюць на месцы каля маланаселеных вёсак і збіраюць цэлыя мяшкі шкляных і ПЭТ-бутэлек. Усцешвае толькі тое, што дзеці такім чынам вучацца сябраваць з прыродай і выконваюць план па здачы другаснай сыравіны.

— Хочацца верыць, што грамадства ўсё ж такі навучыцца быць дысцыплінаваным, — спадзяецца Вячаслаў Міхайлавіч. — За апошнія 15 гадоў, якія я ўзначальваю сельсавет, мысленне людзей наконт парадку істотна змянілася. Раней да тых жа могілак немагчыма было падысці, а сёння людзі культурна нясуць сваё смецце на спецыяльныя пляцоўкі.

**Старшыня Горацкага райсавета Максім ПАТАПЕНКА** не хавае, што праблема са стыхійнымі звалкамі пакуль усё ж даволі вострая.

— Нельга сваімі дзеяннямі шкодзіць прыродзе, — рэзюмуе ён. — Павінна быць чыста не толькі на ўласным двары. Наша малая радзіма — наш агульны дом, які мы атрымалі ў спадчыну ад продкаў і павінны перадаць сваім нашчадкам чыстым і ўтульным.

### «ПЕРАКОНВАЕМ ПАДПІСАЦЬ ДАГАВОРЫ НА ВЫВАЗ СМЕЦЦЯ»

Тэрыторыя Сеніцкага сельсавета, што пад Мінскам, густанаселеная — у аграгарадку Сеніца і яшчэ 14 населеных пунктах пражывае каля 25 тысяч чалавек. Ёсць тут і садовыя таварыствы. «Тэрыторыю сельсавета на наяўнасць несанкцыянаваных звалак абследуем на пастаяннай аснове, — расказала **старшыня Сеніцкага сельсавета Аксана ЕСЬМАН**. — У ходзе маніторынгу нярэдка выяўляем парушальнікаў, знаходзім нядобрасумленных землекарыстальнікаў і выдаём прадпісанне. Гэта робіцца для таго, каб парушальнік аператыўна ліквідаваў пакінуты за сабой беспарадак. Акрамя таго, у ліквідацыі несанкцыянаваных звалак актыўна дапамагаюць нашы арганізацыі».

З садовымі таварыствамі сельсавету пашанцавала, лічыць Аксана Есьман: «Са старшынямі таварыстваў мы на пастаяннай сувязі. Яны трымаюць сітуацыю на кантролі, а ў выпадку чаго мы сумесна вырашаем тую ці іншую праблему. У цэлым, праблемы са смеццем у іх няма. На тэрыторыях таварыстваў устаноўлена відэаназіранне, ёсць спецыяльныя агароджы і новыя кантэйнерныя пляцоўкі».



Пры гэтым, вядома ж, на тэрыторыі сельсавета ёсць упадабаныя месцы, якімі не саромеюцца скарыстацца нядобрасумленныя грамадзяне. «Ім удзяляем асаблівую ўвагу. Калі ж нам у ходзе маніторынгу ўдаецца ўстанавіць нядобрасумленнага домаўладальніка, у такім выпадку складаем пратакол», — падкрэсліла старшыня. «Мы штогод абследуем усе домаўладанні, у выпадку чаго патрабуем неадкладна прыбраць за сабой смецце. Акрамя таго, раздаём грамадзянам памяткі па навядзенні парадку, па ўтрыманні сваёй і прылеглай тэрыторыі. А яшчэ праводзім сходы грамадзян, на якіх расказваем пра важнасць падтрымання парадку на зямлі і пра адказнасць. На такіх сходах разам з адпаведнымі службамі пераконваем наш прыватны сектар заключыць дагаворы на вываз смецця, якое раз на тыдзень забіраюць у людзей прама ад брамак».

Дарэчы, у сельсавеце Аксана Есьман працуе з 2010 года. І тады, па яе словах, несанкцыянаваных звалак было нашмат больш, але адказны падыход да справы дазволіў вырашыць практычна ўсе надзённыя праблемы, якія датычацца забруджвання навакольнага асяроддзя.

### Дарэчы

На ўзроўні краіны Мінская вобласць — адзіны рэгіён, які забяспечвае індывідуальную жылую забудову кантэйнерамі аб'ёмам 120 літраў, у тым ліку за кошт бюджэтных сродкаў, расказала **намеснік генеральнага дырэктара ДА «ЖКГ Мінскай вобласці» Кацярына САЛАЎЁВА**. Пры гэтым спецыяліст расказала пра несуцяшальныя вынікі даследавання, праведзенага на базе Салігорска і найбліжэйшых населеных пунктаў, прыватны сектар якіх цалкам забяспечаны кантэйнерамі на 120 літраў: «Паводле атрыманых даных, толькі 50 % сартуюцца і адпраўляюцца ў кантэйнеры для другаснай сыравіны. І гэта сведчыць аб экалагічнай несвядомасці або недасведчанасці грамадзян, нават нягледзячы на маштабы тлумачальнай работы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Агроскилл», г. Минск, ул. Притыцкого, д. 156, пом. 21, каб. 13 УНП 193691122 |

**Предмет электронных торгов: ТС и оборудование (б/у)**
Местонахождение: Витебская обл., Сенненский р-н, г. Сенно

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Трактор «Беларус» МТЗ-3022, р/з 7624 ВК-2 | 110 000,00 |
| 2 | Трактор Fendt 933, р/з ВК-2 7615 | 350 000,00 |
| 3 | Трактор Fendt 724 Варио, р/з КА-7 1865 | 450 000,00 |
| 4 | Трактор Fendt 724 VARIO, р/з КА-7 5611 | 450 000,00 |
| 5 | Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1319 | 210 000,00 |
| 7 | Автотопливозаправщик ГАЗ C41R13, р/з АМ 6309-2 | 180 000,00 |
| 8-10 | Адаптер для уборки кукурузы «Argus 870» | 75 000,00 |
| 11 | Жатка для зерновых культур ЖЗК-7,5В | 56 000,00 |
| 12 | Косилка ротационная навесная АС-1 | 10 000,00 |
| 13 | Косилка ротационная навесная АС-1-02 N026 | 21 000,00 |
| 14 | Опрыскиватель прицепной HORSCH LEEB 6 LT | 275 000,00 |
| 15 | Плуг полунавесной оборотный Euro Diamant | 105 000,00 |
| 16 | Плуг полунавесной оборотный VIS LS | 75 000,00 |
| 17 | Прицепной разбрасыватель минеральных удобрений RCW8200 Plus, UNIA | 170 000,00 |
| 18 | Блок-контейнер 6*4,8 | 25 000,00 |
| 19-20 | Прицепной опрыскиватель «Примус» 10/3500 Lemken | 110 000,00 |
| 21 | Сеялка пневматическая Soliter 12/1200 K-DS 150 Lemken | 350 000,00 |
| 22 | Сеялка пневматическая Solitair 12/800 K-DS 150 Lemken | 380 000,00 |
| 23 | Универ-ный культиватор Koeckerling Allrounder 750P | 110 000,00 |
| 24 | Шнековый прицеп перегрузчик Bergmann GTW 25 | 230 000,00 |
| 25 | Дисковая борона HORSCH Joker 6 HD | 220 000,00 |
| 26-27 | Гибкий резервуар для КАС объемом 250 $м^3$ | 22 000,00 |
| 28-30 | Гибкий резервуар для КАС объемом 300 $м^3$ | 25 000,00 |
| 31-34 | Гибкий резервуар для КАС 25 $м^3$ | 3 500,00 |
| 35 | Трактор «Кировец» К-742М комплектация «Премиум», зав. номер С0265 | 450 000, 00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**:
**07.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |


ЦІКАВЫ ДОСВЕД

# НА ЭТАПЕ АДНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ

## У Гродне абмеркавалі станаўленне народаўладдзя ў пасляваенны перыяд

У Гродзенскай вобласці рэалізоўваецца цікавы праект «Народаўладдзе на Гродзеншчыне: гісторыя і сучаснасць». Ён прысвечаны гісторыі станаўлення парламенцкай улады ў Беларусі і адлюстроўвае шматлікія вектары дзейнасці дэпутатаў у самыя розныя гады. Праект рэалізуецца сумесна з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы. Студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў праводзяць даследчую работу ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці, якая кладзецца ў аснову падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ. Праект закліка081 запоўніць белыя плямы ў гісторыі, дае магчымасць даведацца больш аб людзях, якія займаліся ў розны час дэпутацкай дзейнасцю, аб выніках іх працы і іх унёску ў аднаўленне і развіццё вобласці. Нядаўна ў рамках праекта прайшоў круглы стол «На шляху да Вялікай Перамогі». Гаварылі аб дзейнасці раённых Саветаў дэпутатаў, якія працавалі над аднаўленнем мірнага жыцця ў 1944—1950 гады. Удзел у ім узялі старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА, рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына КІТУРКА, старшыні раённых Саветаў дэпутатаў, а таксама студэнты і выкладчыкі.



Як адзначыла **Алена ПАСЮТА**, работа мясцовай улады ў перыяд першай пасляваеннай пяцігодкі была складанай і няпростай ва ўсіх адносінах. Гродзенскі абласны Савет дэпутатаў быў арганізаваны ў 1948 годзе, а першая сесія адбылася 10 лютага.

*— У гэты перыяд прымаюцца значныя рашэнні, якія даюць магчымасць больш інтэнсіўна развіваць народную гаспадарку на тэрыторыі Гродзеншчыны.*



> *Мы павінны ведаць гэту частку гісторыі і перадаваць яе сучаснікам і будучым пакаленням. Праект «Народаўладдзе на Гродзеншчыне: гісторыя і сучаснасць» падкрэслівае важнасць і актуальнасць захавання гістарычнай спадчыны.*

*Сталі задачы па аднаўленні гарадоў і вёсак, якія пацярпелі ад вайны. Для гэтага было неабходна аналізаваць падыходы да працы, а таксама ўдасканальваць іх, каб наладзіць дакладную і зладжаную дзейнасць. Сталі задачы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Гэтаму аспекту дэпутаты ўдзялялі пільную ўвагу. Будаваліся і аднаўляліся школы, ішла прафесійная падрыхтоўка педагогаў. Наладжвалася навучанне ў вячэрніх школах, каб людзі, вярнуўшыся з фронту, калі мелі патрэбу ў дадатковай адукацыі, маглі яе атрымаць, — распавяла Алена Пасюта.*

**Ірына КІТУРКА** ў сваю чаргу падкрэсліла, што сумесная работа і абмен вопытам садзейнічаюць развіццю дэмакратычных працэсаў і грамадзянскай супольнасці, што стварае спрыяльныя ўмовы для прагрэсу.



*— Даследчая работа, якая праводзіцца ў рамках праекта, дазваляе ліквідаваць белыя плямы ў гісторыі станаўлення народаўладдзя. Гэта вобласць малавывучаная, і вельмі выдатна, што цяпер ідзе такая актыўная праца. Студэнты ў рамках курсавых і дыпломных работ праводзяць даследаванні і робяць свой унёсак, — адзначыла рэктар.*

У рамках круглага стала студэнты Гродзенскага дзяржуніверсітэта прадставілі даклады, якія асвятляюць ключавыя аспекты аднаўлення рэгіёна пасля вайны. Меркаваннем аб праекце падзяліўся **студэнт 3 курса Канстанцін ЖУКОЎСКІ:**



*— Важнасць дадзенай тэмы бясспрэчная як для грамадства, так і для гістарычнага дыскурсу. Гістарычная памяць займае цэнтральнае месца не толькі ў палітыцы нашай дзяржавы, але і ў фарміраванні самасвядомасці.*

Праект рэалізоўваецца ўжо некалькі гадоў і не страчвае актуальнасці, бо на старонках гісторыі яшчэ шмат цікавых звестак аб дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў. Работа будзе працягвацца. Удзел у сустрэчы старшынь раённых Саветаў дэпутатаў стаў першым крокам для больш дэталёвага вывучэння тэмы. Далейшае даследаванне пашырыцца, стане больш комплексным і дапаможа вывучыць ролі мясцовай улады ў станаўленні і развіцці парламентарызму на Гродзеншчыне ў перыяд з 1950-х да 1960-х гадоў.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота прэс-цэнтра ГрГДУ імя Я. Купалы.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Фанипольскому сельскому исполнительному комитету** (Продавец) на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 20.06.2025.**

**Лот № 1:** VAZ-21214,
кузов (рама) № XTA212140G2253684.

Начальная цена без НДС – 6 640,00 руб.

Местонахождение: Минская обл., Дзержинский район, Фанипольский с/с, д. Вязань, 1А.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# «ГЭТА МАЯ АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАД ЛЮДЗЬМІ»

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## Мікалай Кудзяньчук лічыць, што сёння дэпутат — не проста заканатворца

Удзел у распрацоўцы законапраектаў і грамадска значных праектах, абмеркаванні важных ініцыятыў, падтрымка ветэранаў і маладых спецыялістаў, маніторынг цэн — толькі частка дзейнасці дэпутата Мікалая Кудзеньчука, у цэнтры ўвагі якой — чалавек, яго патрэбы, запыты і надзеі.

### НА СУВЯЗІ З ВЫБАРШЧЫКАМІ

Зона адказнасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў па Рагачоўскай выбарчай акрузе № 45 Мікалая Кудзеньчука — Кармянскі і Рагачоўскі раёны, частка населеных пунктаў Жлобінскага.



У парламенце Мікалай Кудзяньчук працуе ў Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Перад кожным абмеркаваннем новага законапраекта — сустрэчы з жыхарамі, працоўнымі калектывамі, прадстаўнікамі грамадскасці сваёй выбарчай акругі. Прапановы і заўвагі людзей становяцца часткай экспертнага аналізу. Так было, напрыклад, падчас падрыхтоўкі да першага чытання законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей», прынятым у першым чытанні ў лютым. Мікалай Кудзяньчук актыўна ўдзельнічаў у абмеркаванні дакумента, накіраванага на ўзмацненне дзяржаўных гарантый у адносінах да дзяцей, уключаючы папраўкі ў заканадаўства аб сям'і, адукацыі, фізічнай культуры і спорце.

Між тым, як перакананы Мікалай Мікалаевіч, сёння дэпутат — не проста заканатворца. Гэта чалавек, які ведае праблемы свайго рэгіёна і імкнецца да іх вырашэння сумесна з мясцовай уладай і грамадскасцю. Таму работа ў выбарчай акрузе — аснова дэпутацкай дзейнасці. Толькі за мінулы год Мікалай Кудзяньчук правёў 53 сустрэчы з выбаршчыкамі і працоўнымі калектывамі, 15 прыёмаў грамадзян, 13 прамых тэлефонных ліній. Дэпутат таксама прымае ўдзел у пасяджэннях выканкамаў.

### ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ

Не менш важная форма работы — асабістыя прыёмы. Вядома, звароты грамадзян — адлюстраванне жыцця: праблем ЖКГ, пытанняў сацыяльнай падтрымкі, працаўладкавання, медыцынскага абслугоўвання.

— І ніводны зварот не застаецца без увагі. Многія пытанні вырашаюцца аператыўна, з удзелам спецыялістаў райвыканкамаў і адпаведных службаў, — адзначае Мікалай Кудзяньчук.

Як падкрэслівае дэпутат, адным з прыярытэтных кірункаў работы для яго застаецца ахова здароўя. У рамках рэалізацыі сваёй перадвыбарнай праграмы ён ініцыяваў набыццё чатырох аўтамабіляў хуткай медыцынскай дапамогі і мабільнага ФАПа, а таксама пастаўку сучаснага рэнтген-абсталявання для Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы і медтэхнікі для Кармянскай ЦРБ. Праведзены рамонты ў шэрагу медыцынскіх устаноў раёнаў.

— Медыцына павінна быць даступнай і якаснай, асабліва ў сельскай мясцовасці, — адзначае Мікалай Кудзяньчук. — Гэта мая асабістая адказнасць перад людзьмі.

Значнай часткай работы для народнага выбранніка стаў і маніторынг цэн на сацыяльна значныя тавары. Дэпутат асабіста наведвае гандлёвыя пункты, аналізуе дынаміку цэн, параўноўвае прадукцыю па вытворцах і характарыстыках. Гэтыя даныя накіроўваюцца ў Палату прадстаўнікоў і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Такі падыход — не фармальны кантроль, а жорсткая пазіцыя на баку спажыўца.

Мікалай Кудзяньчук актыўна супрацоўнічае з моладдзю, у тым ліку праз Маладзёжны савет пры Нацыянальным сходзе. На прыёмах грамадзян, сустрэчах з жыхарамі раёна маладыя спецыялісты не толькі прысутнічаюць, але і ўключаюцца ў абмеркаванне. Гаварыць пра ўсё, што хвалюе: ад мэтавай падрыхтоўкі і магчымасцяў для самарэалізацыі да патрыятычнага выхавання і валанцёрскага руху.

### ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ — АГУЛЬНАЯ СПРАВА

У Год добраўпарадкавання падчас сустрэч з насельніцтвам, прадстаўнікамі арганізацый і службаў Мікалай Кудзяньчук актыўна абмяркоўвае тэмы захавання належнага стану тэрыторый населеных пунктаў, экалагічны аспект, неабходнасць збору другасной сыравіны. Напрыклад, на адной з сустрэч прагучала прапанова аб стварэнні мабільных пунктаў прыёму такіх матэрыялаў — і гэта ўжо ўключана ў план абмеркаванняў з мясцовымі ўладамі.

— Увогуле ў сваёй дэпутацкай дзейнасці імкнуся быць там, дзе патрэбны людзям, — рэзюмуе Мікалай Кудзяньчук. — І мая задача — не толькі прадстаўляць інтарэсы рэгіёна ў Палаце прадстаўнікоў, але і быць звяном паміж чалавекам і дзяржавай. Кожны зварот, кожнае пытанне — гэта адказнасць. І я ўдзячны ўсім, хто давярае і дапамагае: кіраўніцтву рэгіёнаў, калектывам, звычайным жыхарам, бо мы працуем дзеля агульнага дабра, — падкрэслівае Мікалай Мікалаевіч.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота газеты «Зара над Сожам».**

ДОБРАЯ СПРАВА

# НАВЯЛІ ПАРАДАК НА МОГІЛКАХ

## Старыя дрэвы спілаваны за кароткі тэрмін

Вельмі прыемна было прачытаць шчырыя словы падзякі, адрасаваныя праз нашу газету кіраўніцтву Стайскага сельвыканкама жыхаркай г. Лепеля Віцебскай вобласці Наталляй Седзінай.

— Адзначу, што прадстаўнікі мясцовай улады з асаблівай увагай ставяцца да праблем і патрэб людзей, — піша Наталля Іванаўна. — Разам з роднымі мы часта наведваем могілкі каля вёскі Ворань Лепельскага раёна. Прыехаўшы нядаўна, звярнулі ўвагу на тое, што тут шмат старых дрэў, якія патрэбна спілаваць. З гэтым пытаннем мы звярнуліся да старшыні Стайскага сельвыканкама Аксаны Церашковай. Наша просьба была задаволена на працягу некалькіх дзён. Калі чарговы раз прыехалі на могілкі, адразу адзначылі, што вакол стала больш светла, старыя дрэвы спілаваны, усюды — асаблівы парадак і чысціня. Такія справы — яркі доказ таго, што набалелым пытанням жыхароў раёна ўдзяляецца асаблівая ўвага.

Як растлумачыла старшыня Стайскага сельвыканкама Аксана Церашкова, у ліквідацыі старых дрэў аказаў садзейнічанне індывідуальны прадпрымальнік Віктар Лобкіс. Работнікі пад яго кіраўніцтвам займаюцца добраўпарадкаваннем раёна. Просьба сельвыканкама выдаліць старыя дрэвы на могілках была выканана аператыўна. Такая работа, вядома, заслугоўвае асаблівай падзякі.

**Святлана ВАЗНЯК.**

*Вельмі важна, што актыўная работа на карысць людзей знаходзіць станоўчыя водгукі ў саміх жыхароў. Справы гавораць самі за сябе. Калі ў вас ёсць словы падзякі за клопат, шчырасць і ўвагу з боку мясцовай улады, пішыце. Добрыя словы ўсім прыемныя.*

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Речицкого РайПО** (продавец) извещает о проведении **8 июля 2025 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Капитальное строение инв. № 340/С-3204617 площадью 261,8 кв. м, назначение – Здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324584402101000007 площадью 0,1030 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Защёбьевский с/с, д. Глинная Слобода, ул. Центральная, 92.
Лот включает оборудование в количестве 20 ед.
Перечень опубликован на сайте www.deloocenka.by

**Начальная цена** продажи без НДС – 40 232,50 бел. руб.
**Задаток** – 402,33 бел. руб.

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 33 643-43-14.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00** до **13.00** и с **14.00** до **17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 07.07.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Алексеевичи-Агро», Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Немержа, ул. Ленина, д. 34 |
| **Предмет электронных торгов – имущество, реализуемое одним.** Адрес: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Немержанский с/с, 16, 16/1, 16/2, 16/3, 0,3 км восточнее д. Переспа | |
| **1. Молочный блок (Здание специализированное животноводства),** инв. номер 121/С-18347, общей площадью 94 кв. м. **2. Телятник (Здание специализированное животноводства),** инв. номер 121/С-18348, общей площадью 1584,7 кв. м. **3. Склад № 3 (Здание специализированное сельскохозяйственного назначения),** инв. номер 121/С-18349, общей площадью 180,2 кв. м. **4. Здание трансформаторной (Здание специализированное энергетики),** инв. номер 121/С-18350, общей площадью 47,8 кв. м. **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122084500001000199:** предоставлен на праве аренды по 27.08.2073 г. общей площадью 3,1723 га для строительства и обслуживания зданий и сооружений фермы | |
| **Начальная цена, с НДС 20 % – 149 880,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **07.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **04.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ЗАСО «Имклива Иншуранс» **объявляет о недействительности бланка** страхового полиса добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии ГР № 0053315 в связи с его утратой.

УНП 400217363

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Потсдам», г. Лида, Гродненская обл., г. Лида, ул. Летная, 4 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (имущество, реализуемое одним лотом)**

**Здание кафе «Полюс»** (инв. № 420/С-4701, общ. пл. 533,3 кв. м) по адресу: Гродненская обл., ***г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 1.*** Сост. части и прин-ти: в-Водопроводная сеть, а-Канализационная сеть, б-Тепловая сеть, г-Сооружение благоустройства.
***Обременение:*** договор аренды.
**Здание пункта приема стеклотары** (инв. № 420/С-4740, общ. пл. 76,1 кв. м) по адресу: Гродненская обл., ***г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 3***. Сост. части и прин-ти: Б1/к-Склад, В1/к-Склад,(Б1/к)-Погреб, а-Сооружения благоустройства.
В состав лота входит иное имущество, подробнее ознакомиться можно на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

**Сведения о земельных участках: 1** – общ. пл. 0,1640 га предоставлен продавцу для размещения объектов общественного питания на праве постоянного пользования. **2** – общ. пл. 0,0283 га предоставлен продавцу для обслуживания пункта приема стеклотары на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 524 083,20 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение и затраты за проведение независимой оценки продавцу, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.05.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 17.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15215 (наименование: жилой дом; назначение: здание блокированного жилого дома) площадью 73,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, д. Большие Сехновичи, ул. Центральная, 22, на земельном участке с кадастровым номером 122581001601000106, площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: пристройка, сарай, сарай, сарай, уборная | 6 437,00 | 643,70 |

**Продавец:** ОАО «Матеевичи», 225101, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Кривляны, ул. Ленина, 5-1, тел. 80164131445. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 01 июля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 июня 2025 г. до 17.00**

# ПРАГРАМА МІНІМУМ — ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА І ПЛЯЖ

## Якімі клопатамі жыве Хацíслаўскі сельвыканкам напярэдадні летняга сезона

Не так даўно ў вёску Мельнікі Маларыцкага раёна прыйшла добрая навіна з вобласці. Грамадзянская ініцыятыва па ўстаноўцы дзіцячай спартыўна-гульнявой пляцоўкі названая ў ліку пераможцаў па выніках конкурсу абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў, расказаў старшыня Хацíслаўскага сельскага Савета Эдуард ПАЎЛАЎ.



Эдуард Васільевіч падкрэслівае, што ідэя нарадзілася менавіта ў асяроддзі жыхароў вёскі. Дзіцячая пляцоўка ёсць у суседнім Хацíславе, а Мельнікі — таксама вялікая вёска, тут пражывае каля 600 чалавек. Вось і ўтварылася ініцыятыўная група, яе актывісты правялі гутарку з жыхарамі, апошнія выказалі рашучасць паўдзельнічаць у фінансаванні добрай справы. Афармілі належным чынам дакументы, падалі ў асацыяцыю. А калі прыйшло адабрэнне, гэтая ж група за тыдзень сабрала больш чым 2000 рублёў. Грошы залічылі на адпаведны рахунак. Тым часам мясцовая ўлада ўзялася за падрыхтоўку ўчастка для будучай пляцоўкі. Дамовіліся з найбліжэйшымі прадпрыемствамі — гаспадаркай, лясгасам — аб шэфскай дапамозе ў плане добраўпарадкавання, вывучылі прапановы магчымых пастаўшчыкоў абсталявання.




Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, як толькі паступяць грошы, адразу будуць набыты кампаненты для гульнявой пляцоўкі для малых, а для старэйшых — гімнастычны комплекс, які складаецца з турніка, брусаў, іншых снарадаў. Усё для таго, каб дзеці выйшлі на вуліцу: малыя пагулялі на свежым паветры, а школьнікі адарваліся ад гаджэтаў, пазаймаліся фізкультурай з карысцю для здароўя. Вясковая грамада ўжо раіцца аб тым, як набыць дэкаратыўныя кусты, разбіць клумбы, каб гэта мясціна стала не толькі карысным аб'ектам, але і ўпрыгажэннем вёскі.

Да летняга сезона рыхтуецца і мясцовая славутасць — возера, дакладней, прыбярэжная зона. Вадаём утварыўся на месцы былога пясчанага кар'ера. Пясок выбралі, прыйшла вада, людзі сталі купацца, хоць гэта раней было пад забаронай. Даволі крутыя берагі не адпавядалі патрабаванням бяспекі, зноў жа, не было ніякай інфраструктуры для адпачынку. Два гады таму райвыканкам прыняў адпаведную пастанову, і бераг уладкавалі, прывезлі белага пяску. А цяпер работы па пляжшэнні і ўладкаванні пляжнай зоны працягваюцца. Тут ужо ёсць кабіны для распранання, туалеты, устаноўлена вялікая альтанка. Яшчэ размясцілі стэнды з інфармацыяй для адпачывальнікаў. Напрыклад, абазначылі месца для купання дзяцей. На возеры з'явіўся будынак ратавальнага паста. «Толькі вось персанал яшчэ не падабраны, — гаворыць Эдуард Паўлаў. — Думаем на лета прапанаваць магчымасць падпрацоўкі студэнтам, якія прыедуць на канікулы. Хлопцам, якія ўмеюць плаваць, трэба будзе прайсці невялікае навучанне, і можна будзе заступаць на дзяжурства па зменах».

Вадаём цікавы не толькі гісторыяй, якую вывучаюць мясцовыя краязнаўцы, але і энтузіястамі-валанцёрамі, такімі як Алена Фёдараўна Ківачук. Па падказцы дактароў яна стала займацца пешымі прагулкамі ў раёне вадаёма. Аднойчы жанчына ўзяла пакет і сабрала смецце, якое трапілася на шляху. А потым гэта ўвайшло ў прывычку, і Алена Фёдараўна стала прыбіраць пастаянна. Адзін час у яе быў паслядоўнік, студэнт з суседняга Хацíслава, але цяпер ён жыве ў Мінску. Пенсіянерка ж не адмаўляецца ад прывычкі рабіць навакольны свет больш чыстым і прыгожым.

**Старшыня Маларыцкага раённага Савета Эдуард КАНДЗЯРЭШКА** адзначае:

**— У вёсках Хацíслаўскага сельскага Савета жывуць надзвычай дружныя людзі. Сведчаннем таму ініцыятывы, якія яны ператвараюць у жыццё, а таксама цэлы шэраг добрых спраў, што робяцца талакой. Вось і гэты праект па ўладкаванні дзіцячай пляцоўкі ажыццяўляецца грамадой з падтрымкай мясцовай улады. У працэсе ўстаноўкі пляцоўкі ў Мельніках, мантажу, далейшага добраўпарадкавання адбудзецца яшчэ не адзін суботнік.**




**А сумесная работа здружвае, спрыяе здаровай атмасферы. Ужо і цяпер зразумела, што два разы запрашаць гэтых людзей не давядзецца. Не так даўно ў Хацíславе, паводле рашэння сельскага сходу, прыводзілі ў парадак стадыён. На працоўную акцыю выйшлі 87 чалавек розных узростаў.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 10 928. Нумар падпісаны ў 19.30 3 чэрвеня 2025 года.**

ВЕКАПОМНАЕ

# ВЫРАТАВАЛІ З ВІЦЕБСКІХ «АЗАРЫЧАЎ»

**4 чэрвеня 1944 года разведчыкі-чырвонаармейцы вызвалілі вязняў «Лагера 12-тысячнікаў», віцебскага аналага гомельскіх «Азарычаў»**

Фронт пад Віцебскам стаяў паўгода — з канца снежня 1943-га да чэрвеня 1944-га. Акупанты разумелі, што наступленне Чырвонай Арміі непазбежна. Таму імкнуліся забяспечыць сваю бяспеку на захопленай тэрыторыі. Раптам у Віцебску зноў, як было ўжо не раз, паднімуць галовы патрыёты, гатовыя на барацьбу, на дапамогу вызваліцелям?

З сакавіка захопнікі пачалі праводзіць аблавы, без разбору хапаць і кідаць мірных жыхароў у канцлагер «5-ы полк». У 1941 годзе ён быў лагерам для ваеннапалонных, потым сюды прымусова звязшчалі яўрэяў, сем'і народных змагароў, усіх, хто трапляў пад падазрэнне. За тры гады існавання праз «5-ы полк» прайшло каля 150 тысяч чалавек. Напярэдадні наступлення Чырвонай Арміі фашысты старанна імкнуліся як мага больш зачысціць горад ад «небяспечных элементаў». Да канца мая абласны цэнтр зусім абязлюдзеў.

**Гэта адна з прычын, чаму вызваліцеляў Віцебска замест 180-тысячнага даваеннага насельніцтва сустракалі ўсяго 118 ацалелых жыхароў, якія ўрэшце павыходзілі са схованак у руінах.**

У канцы мая вязняў канцлагера па чыгунцы сталі перавозіць у напрамку Лёзна і Багушэўска, бліжэй да пярэдняй лініі фронту. Там — проста ў лесе, пад адкрытым небам — падрыхтавалі некалькі месцаў прымусовага ўтрымання няшчасных. Іх было каля 12 тысяч.

Разам з бабуляй і малодшай сястрычкай сярод іх была віцябчанка Мая Александровіч (у дзявоцтве Карпенка). Ёй цяпер 91 год.

— Памятаю, лес быў высечаны пад корань, — згадвае жанчына. — Разам са здаровымі людзьмі ўтрымлівалі хворых, у тым ліку на тыф. Нас не кармілі. Нават вады не давалі. Людзі пілі з брудных лужын, елі траву, кару. Не было цёплага адзення, агню. Вялізныя вырубкі былі абнесены дротам, па якім ішоў ток. На маіх вачах адзін хлопец хацеў уцячы, але яго забіла токам. На вышках стаялі вартавыя з аўтаматамі. За дротам было міннае поле.

Вязні павінны былі стаць жывым шчытом перад сваімі. Бязвінныя людзі маглі загінуць пад агнём з абодвух бакоў фронту, што, безумоўна, пакінула б адбітак на маральным настроі чырвонаармейцаў. Або, спадзяваліся фашысты, яны, хворыя і знарнелыя, станучь біялагічнай зброяй супраць сваіх жа. У рэшце рэшт перамруць: расходны матэрыял не шкада.



Міхаіл Маскаеў.

...Ноччу ўзвод разведчыкаў 66-й асобнай разведвальнай роты 97-й стралковай дывізіі пад камандаваннем лейтэнанта Міхаіла Маскаева вяртаўся з задання. Хлопцы пачулі людскі плач і енк: яны выпадкова натрапілі на канцлагер, дзе, як высветлілася, былі зняволены тысячы мірных савецкіх грамадзян. Літаральна назаўтра гэта месца магло аказацца на лініі агню. Часу на роздум не было. Чырвонаармейцы прынялі рашэнне ратаваць людзей. Бясшумна знялі ахову, размініравалі праход — і павялі вязняў за сабой.



Мая АЛЕКСАНДРОВІЧ — адна з былых вязняў «Лагера 12-тысячнікаў».

— Нам вельмі строга загадалі ісці след у след, таму што сярод мін быў толькі вузкі праход, — і цяпер затрымлівае дыханне Мая Александровіч. — Маю маленькую сястрычку наш салдат нёс на руках. Мы выбраліся.

Без ахвяр, на жаль, не абышлося. 4 чэрвеня 1944 года стала асаблівым днём для самога Міхаіла Маскаева: у Маскве быў падпісаны ўказ аб прысваенні яму звання Героя Савецкага Саюза, а ў лесе пад Віцебскам ён наступіў на міну. Параненую нагу давялося ампутаваць.

Разведчыкі выратавалі 8 тысяч чалавек.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА, фота аўтара.**

## Извещение о проведении Лепельским районным исполнительным комитетом конкурса на предоставление права аренды рыболовных угодий, расположенных на территории Лепельского района Витебской области

| № лота | Наименование предмета торгов | Площадь, га | Тип, класс, категория | Направление деятельности | Место расположения рыболовного угодья | Срок аренды, лет | Сумма ежегодной арендной платы, бел. руб. | Сумма задатка в размере 20 % от суммы ежегодной арендной платы, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды озера Островки | 54,00 | Окунево-плотвичный | Промысловое рыболовство | В 30 км на северо-восток от г. Лепеля, 1 км от дер. Суша | 20 | 453,6 | 90,72 |

ОРГАНИЗАТОР – Лепельский районный исполнительный комитет, 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (02132) 3 49 84, интернет-сайт lepelrik@lepel.vitebsk-region.gov.by

АРЕНДОДАТЕЛЬ – Витебский областной исполнительный комитет, 210010, г. Витебск, ул. Гоголя, д. 6, контактный телефон (0212) 48 11 55.

1. **Конкурс состоится 8 июля 2025 г. в 11.00 по адресу: 211174, Витебская область г. Лепель, ул. Ленинская, д. 6, каб. 101.**

2. Для участия в конкурсе приглашаются юридические лица. Участникам конкурса не позднее 27.06.2025 г. необходимо в адрес организатора предоставить следующие документы:

заявление, в котором указываются сведения о рыболовных угодьях, которые участник торгов желает получить в аренду по результатам торгов.

**К заявлению прилагаются:**

- запечатанная в отдельном конверте копия комплексного плана использования рыболовных угодий (далее – комплексный план), разработанного в соответствии с требованиями к его содержанию и форме, установленными Советом Министров Республики Беларусь;
- письменные предложения участников конкурса о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе проведения конкурса;
- копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;
- доверенность представителя участника конкурса и копия документа, подтверждающего его личность (в случае если заявление подписывается не руководителем участника конкурса), либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника конкурса;
- биолого-экономическое обоснование ведения рыболовного хозяйства, согласованное в порядке, установленном Советом Министров Республики Беларусь;
- документы, подтверждающие возможность участия юридического лица в конкурсе указанные в пункте 3 настоящего извещения.

3. К участию в конкурсе допускаются юридические лица:

- в отношении которых не возбуждено производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) и не принято решение об открытии ликвидационного производства;
- руководители которых не привлекались к административной ответственности за правонарушения против экологической безопасности, окружающей среды и порядка природопользования и (или) уголовной ответственности за преступления против экологической безопасности, окружающей среды и порядка природопользования в течение последних пяти лет;
- в отношении руководителей которых не принимались решения суда о досрочном расторжении (прекращении действия) аналогичного договора с участником конкурса в связи с нарушением им существенных условий такого договора в течение десяти лет до проведения конкурса.

4. Для участия в конкурсе участниками конкурса вносится задаток в размере 20 процентов от суммы ежегодной арендной платы на расчетный счет Лепельского райисполкома 90,72 рублей, наименование платежа: задаток для участия в конкурсе с подачей в комиссию заявления. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе на расчетный счет: BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000, ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X УНП300039625, ОКПО 040626632000

5. **Документы, необходимые для участия в торгах, принимаются организатором аукциона по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, д. 6, каб. 220 с 08.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 в рабочие дни. Последний день приема документов – 27 июня 2025 г. до 17.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

6. Порядок проведения конкурса определяется Положением о порядке проведения конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.06.2022 № 366 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 21 июля 2021 г. № 284».

7. Конкурс проводится при наличии заявлений двух и более участников конкурса. В случае если заявление подано только одним участником конкурса и его предложения соответствуют условиям конкурса, заключение договора аренды рыболовных угодий осуществляется с этим участником конкурса на предложенных им условиях.

8. Победителем конкурса считается участник, который предоставит лучшие предложения о выполнении условий конкурса, которые должны отвечать следующим требованиям:

- сохранение и рациональное использование рыбных ресурсов;
- восполнение изымаемых рыбных ресурсов с целью сохранения видового разнообразия;
- предотвращение загрязнения береговых участков рыболовных угодий;
- осуществление охраны рыболовных угодий;
- обеспечение вылова рыбы согласно установленным квотам на вылов рыбы;
- обеспечение свободного доступа граждан к рыболовным угодьям для осуществления их права общего природопользования;
- обязательное заключение со специализированными организациями договоров на вывоз и утилизацию отходов;
- организовать установку: емкости для сбора отходов (1 шт.), туалета (1 шт.), лодочного причала, представленного понтонным модулем (без проведения работ по изменению рельефа дна водного объекта) (1 шт.), информационных аншлагов (3 шт.);
- провести лабораторные исследования качества вод арендуемого поверхностного водного объекта по окончанию договорных отношений, а также в случае возникновения аварийных ситуаций на арендованном поверхностном водном объекте.

9. Организатор конкурса вправе отказаться от торгов не позднее чем за 30 дней до их проведения. Участник конкурса имеет право до наступления даты проведения конкурса письменно отозвать заявление.

10. Победителю конкурса, его единственному участнику размер внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору аренды рыболовных угодий, заключаемому по результатам конкурса, при внесении платы за аренду рыболовных угодий.

Если победитель конкурса, его единственный участник отказался от подписания протокола конкурса, комиссией составляется соответствующий протокол, при этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит.

11. Победитель конкурса, его единственный участник возмещает Лепельскому районному исполнительному комитету затраты на организацию и проведение конкурса.

Участникам конкурса, не признанным победителями конкурса, задаток возвращается в течении пяти рабочих дней после даты проведения конкурса.

12. Возмещение исполнительному комитету затрат на организацию и проведение конкурса, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем конкурса, его единственным участником. Размер такого возмещения не должен превышать размер фактических затрат на организацию и проведение конкурса, изготовление документации, необходимой для его проведения.

Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения будет доведена до сведения участников конкурса до начала его проведения.

13. Адрес и номер контактного телефона секретаря комиссии: Витебская обл., г. Лепель, ул. Ленинская, 6, каб. 218, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с перерывом на обед с 13.00 до 14.00.

**Контактный телефон 8 (02132) 3 49 84**

# КАЛІ ЛЁГКІМ НЯЛЁГКА

## ПОСПЕХІ Ў ЛЯЧЭННІ

Сёння ва ўстанове 317 ложкаў, у тым ліку 180 — для лячэння туберкулёзу, 55 — для таракальнай хірургіі, 70 — пульманалагічнага профілю, 12 — рэанімацыйных, маецца аперацыйны блок. Са студзеня бягучага года ў цэнтры працуе Рэспубліканскі кансультатыўны цэнтр.

— Мы валодаем шырокім спектрам дыягнастычных магчымасцяў, якія ўключае метады прамянёвай дыягностыкі, КТ, рэнтген, УГД, функцыянальную спіраметрыю, бодыплетызмаграфію, лабараторную дыягностыку. На базе ўстановы функцыянуе Рэспубліканская рэферэнс-лабараторыя па туберкулёзе, — расказвае **дырэктар РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Алена КРАТКОВА.**

Высокапрафесійны калектыў цэнтра складаецца з 445 супрацоўнікаў, у тым ліку 70 урачоў, з якіх 92,5 % маюць кваліфікацыйныя катэгорыі, прычым кожны трэці — вышэйшую. Навуковы аддзел складаецца з 18 супрацоўнікаў, з іх 14 — кандыдаты навук, 8 — дацэнты, 2 — дактары навук, 1 — прафесар. Цяпер яны вядуць 11 навукова-даследчых работ па пульманалагічным і фтызіятрычным профілі.

— Наша фтызіятрычная служба дасягнула поспехаў у барацьбе з туберкулёзам. За апошнія 15 гадоў паказчык захваральнасці знізіўся ў 3,6 раза, а паказчык смяротнасці — у 8 разоў. Адзначаюцца адзінкавыя выпадкі захваральнасці на туберкулёз сярод дзяцей. Разам з тым актуальнасць неспецыфічных захворванняў органаў дыхання, інтэрстыцыяльных захворванняў з кожным годам нарастае, — адзначае Алена Краткова.



## УНІКАЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Кіраўнік РНПЦ падкрэсліла, што цэнтр валодае ўнікальнымі магчымасцямі па дыягностыцы хвароб органаў дыхання. Сярод іх верыфікацыя хірургічным спосабам, магчымасць правядзення фібрабронхаэндаскапічных абследаванняў, бодыплетызмаграфія.

Бодыплетызмограф — адзіны апарат, які дазваляе вывучыць дыфузійную здольнасць лёгкіх. Як растлумачыў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Дзмітрый РУЗАНАЎ,** яна зніжаецца ў пацыентаў з міжтканкавымі хваробамі лёгкіх, якіх у Беларусі цяпер, дарэчы, дастаткова шмат. Гаворка ідзе аб станах, калі развіваецца лёгачны фіброз, які паступова замяшчае лёгкае злучальнай тканкай і, умоўна, душыць пацыента. Так спыняецца дыфузія газаў.

Бодыплетызмаграфія дазваляе своечасова вызначыць, наколькі зніжана функцыя лёгкіх. Падставай да даследавання можа стаць задышка пры адсутнасці іншых прычын, напрыклад хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх, бранхіяльнай астмы, а таксама змены на рэнтгенаграме, якія сведчаць аб прэваліраванні лёгачнага фіброзу.

Даследаванне неабходна для наступнай пастаноўкі дыягназу і прызначэння лячэння.

— Бодыплетызмаграфія дазваляе ацаніць унутрыгрудны аб'ём лёгкіх і ўсе яго складнікі, а таксама супраціўленне бронхаў. Гэтыя параметры немагчыма вымераць з дапамогай звычайнай спіраметрыі, таму бодыплетызмаграфія значна дапаўняе інфармацыю, атрыманую пры выкананні спіраметрыі, — патлумачыў Дзмітрый Рузанаў.

Спецыяльны модуль для правядзення дыфузійнага тэста дае магчымасць вывучыць газаабменную функцыю лёгкіх — эфектыўнасць пераносу кіслароду з паветра, якое ўдыхаецца, у кроў. Такое ўнікальнае абсталяванне маецца толькі ў РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі, а таксама ў Рэспубліканскім клінічным медыцынскім цэнтры Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сёлета плануецца закупіць у цэнтр новы бодыплетызмограф. А ў 2026—2027 гадах такія апараты з'явяцца ва ўсіх абласных цэнтрах — іх закупяць у абласныя спецыялізаваныя ўстановы, дзе ёсць аддзяленні пульманалогіі.

## КІНУЦЬ КУРЫЦЬ ДАПАМОЖА ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

Як адзначыла Алена Краткова, кожны другі пацыент цэнтра мае ў анамнезе фактар курэння. Мільярды людзей, якія кураць, зніжаюць узровень свайго здароўя з-за нікаціну. Кожная сёмая смерць у свеце выклікана курэннем. Чаканая працягласць жыцця тых, хто курыць, прыкладна на 10 гадоў меншая, чым тых, у каго няма такой шкоднай звычкі.

**Кіраўнік краінавага офіса СААЗ у Беларусі Сяргей ДЗІЯРДЗІЦА** дадаў, што за апошняе дваццацігоддзе колькасць школьнікаў ва ўзросце ад 13 да 15 гадоў, якія кураць звычайныя цыгарэты, скарацілася ў 5 разоў, што з'яўляецца вялікім дасягненнем. Аднак на змену цыгарэтам прыйшлі новыя тэхналогіі — вэйпы. Каля 14 % хлопчыкаў і 15 % дзяўчынак гэтага ўзросту ўжывалі іх. Тытунёвыя кампаніі імкнуцца зрабіць сваю прадукцыю ўсё больш прыцягальнай, асабліва для моладзі, нягледзячы на вялікую шкоду здароўю. Сярод прыёмаў — араматызатары і смакавыя дабаўкі, якія маскіруюць непрыемны смак тытуню; яркі дызайн упакоўкі і агрэсіўны маркетынг у сацсетках. СААЗ рэкамендуе поўную забарону продажу любых вэйпаў непаўналетнім, незалежна ад утрымання нікаціну, забарону рэкламы і спонсарства, як гэта дзейнічае ў дачыненні да цыгарэт.

А вось у РНПЦ псіхічнага здароўя распрацоўваюць матывацыйную праграму на аснове штучнага інтэлекту для ахвотных кінуць курыць.

— Праграма распрацоўваецца ў рамках навуковага праекта. Выкарыстоўваецца тэхналогія штучнага інтэлекту з улікам адрозненняў у рабоце паўшар'яў мозга. Дадаецца ацэнка з дапамогай апытальнікаў і прапаноўваецца матывацыйны ролік, які дае магчымасць узмацніць жаданне кінуць курыць, — адзначыла **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ доктар медыцынскіх навук, прафесар Марына СКУГАРЭЎСКАЯ**, звярнуўшы ўвагу на тое, што асноўная праблема курцоў — адсутнасць устойлівага жадання кінуць курыць. Праграма з'яўляецца адным з варыянтаў шматузроўневага лячэння. Акрамя таго, прапануюцца медыкаментозная падтрымка, псіхатэрапія.

**Нікацін вельмі негатыўна адбіваецца на псіхічным стане курца, выклікае сіндром залежнасці з усімі ўласцівымі яму крытэрыямі: цягай, стратай кантролю, сіндромам адмены.**

— Існуе меркаванне, і гэта самападман, што нікацін, тытунь дапамагаюць у барацьбе са стрэсам. На самай справе тытунь садзейнічае развіццю трывожнасці і дэпрэсіі. Людзі, якія кураць, часцей пакутуюць ад гэтага. Прычым у іх не проста павышаецца ўзровень трывожнасці і дэпрэсіі, а нават магчымае развіццё псіхічнага расстройства. У курцоў часцей праяўляюцца эмацыянальная нестабільнасць, перапады настрою, раздражняльнасць і агрэсіўнасць. Парушаюцца кагнітыўныя (пазнавальныя), інтэлектуальныя функцыі, — звярнула ўвагу Марына Скугарэўская.

Асабліва негатыўна нікацін уплывае на арганізм, калі пачынаць курыць у дзіцячым узросце.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Первые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 19.04.2025 в газете «Звязда» № 77 (30465), стр. 11**

**Предмет электронного аукциона**

| № | **Наименование (назначение), адрес** | **Начальная цена с учетом НДС, бел. руб.** | **Минимальная цена с учетом НДС, бел. руб.** |
|---|---|---|---|
| **1** | Автотранспортный участок, состоящий из 8 капитальных строений, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102 | 2 343 333,24 | 1 562 222,16 |

**Первые публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **2** | Станок токарно-винторезный 1К625, завод. № 11455, инв. № 4034, бывший в эксплуатации | 6120,00 | 4284,00 |
| **3** | Реактор химический с мешалкой, инв. № 3095, бывший в эксплуатации | 18 564,00 | 12 994,80 |
| **4** | Реактор химический с мешалкой, инв. № 3096, бывший в эксплуатации | 18 564,00 | 12 994,80 |
| **5** | Склад сажи, корпус № 35, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/24 | 250 464,00 | 175 324,80 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников электронного аукциона начальная цена электронного аукциона поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками электронного аукциона

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения электронного аукциона. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **1–4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:**
**Лот № 1:** 19.06.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 04.06.2025 по 18.06.2025 г. до 16.00.
**Лоты №№ 2–5:** 07.07.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 04.06.2025 по 02.07.2025 г. до 15.00.
Электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ

# КАБ ВАДА НЕ СТАЛА БЯДОЙ

## Што трэба ведаць на старце купальнага сезона

Лета паступова ўступае ў свае правы. Нягледзячы на афіцыйнае адкрыццё купальнага сезона, надвор'е пакуль не дазваляе камфортна адпачываць на вадаёмах. Тым не менш першыя ахвяры вады ўжо ёсць... У прыватнасці, у садовым таварыстве ў Віцебскім раёне 24 мая патанула дзіця. Хлопчык 2018 года нараджэння разам з кампаніяй дзяцей адправіўся да вадаёма, дзе і адбылася трагедыя.

Напярэдзе — гарачыя выхадныя. Таму рэкамендуем прыслухацца да парад ратавальнікаў.

### ДЗЕЦІ — ПАД ПІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ!

З пачатку года ў вадаёмах краіны патанулі 87 чалавек. Сярод іх — двое дзяцей. Летась вада забрала жыцці 19 непаўналетніх.

«Як вядома, больш за іншых да небяспекі схільныя дзеці, — звяртае ўвагу **намеснік начальніка цэнтра ўзаемадзеяння з грамадскасцю і СМІ МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Менавіта таму, адпраўляючыся з дзецьмі на вадаём, растлумачце ім, як трэба сябе паводзіць, каб не трапіць у бяду. Не выпускайце іх з-пад увагі. Заўсёды будзьце напагатове, бо дапамога можа спатрэбіцца малому ў любы момант. Не забывайце і пра тое, што дзіця бярэ прыклад менавіта з вас, таму ў першую чаргу строга выконвайце правілы паводзін на вадзе самі!»

Не дапусціць, каб бяда прыйшла ў вашу сям'ю, — задача кожнага дарослага, які павінен загадзя паклапаціцца аб тым, каб дзеці праводзілі канікулы не толькі цікава і карысна, а яшчэ і бяспечна. Самае простае — не адпускайце на вадаёмы дзяцей без дарослых, нават калі непаўналетнія дагэтуль хадзілі туды самі і добра ўмеюць плаваць. Здараюцца трагедыі і ў прысутнасці дарослых. Як правіла, гэта адбываецца тады, калі апошнія замест таго, каб назіраць за дзецьмі, праводзяць час за спажываннем алкаголю.

Не варта расслабляцца і на тэрыторыі ўласнага домаўладання. На жаль, тонуць дзеці і ў штучных вадаёмах, размешчаных каля хаты, і нават у невялікіх надзіманых басейнах, што сталі неад'емнай часткай прысядзібнага ландшафту. У такім выпадку дарослыя павінны абмеркаваць з дзецьмі правілы паводзін на вуліцы, не забываючыся пры гэтым пра асабісты рэгулярны кантроль.

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ СУТАРГА І ВІР?

На жаль, элементарнымі правіламі бяспекі на вадаёмах грэбуюць дарослыя, не кажучы ўжо пра дзяцей . Адна з прычын няшчасных выпадкаў — пачуццё меры, якое многія губляюць, забываючы, што доўгае знаходжанне ў вадзе прыводзіць да пераахаладжэння арганізма.

«Калі вы адчулі дрыжыкі, трэба неадкладна выйсці на бераг і зрабіць кароткую, але энергічную прабежку, — рэкамендуе Анастасія Швайбовіч. — Працягласць купання залежыць ад тэмпературы паветра і вады, сілы ветру. Не ныральце з разбегу, заходзьце ў ваду паступова, каб даць целу прызвычаіцца да перападу тэмператур і пазбегнуць спазмаў крывяносных сасудаў.

### ЗАБАРАНЯЕЦЦА:

- пакідаць дзяцей без нагляду каля вады;
- заплываць за знакі агароджы і папераджальныя знакі;
- купацца і ныраць у забароненых і невядомых месцах;
- купацца ў стане алкагольнага ап'янення;
- скакаць у ваду з дамбаў, прыстаняў, катараў, лодак, плытоў;
- дапускаць свавольствы, звязаныя з ныраннем і захопам канечнасцяў тых, хто купаецца, узбірацца на буі, іншыя тэхнічныя збудаванні;
- падаваць ілжывыя сігналы бедства;
- перамяшчацца ў лодцы з месца на месца пры катанні;
- выкарыстоўваць для плавання дошкі, бярвёны, надзіманыя матрацы, камеры аўтамашын, іншыя дапаможныя сродкі;
- забруджваць і засмечваць вадаёмы.



Калі вы шмат часу правялі на сонцы, не спяшаецеся заходзіць у ваду: адыдзіце ў цень, астыньце і толькі потым ідзіце плаваць. Не варта купацца на галодны страўнік ці адразу пасля прыёму ежы».

Ні ў якім разе нельга заходзіць у ваду падчас навальніцы! Не варта адплываць далёка ад берага на надзіманых матрацах і кругах. Калі плаваеце дрэнна, трымайцеся бліжэй да берага, каб у любы момант дакрануцца да дна нагамі.

Даволі часта падчас плавання канечнасці зводзіць сутарга. Яна можа ўзнікнуць калі заўгодна і дзе заўгодна, таму гатовым трэба быць заўсёды. Калі вы адчулі, што звяло нагу (часцей за ўсё ікраножную мышцу) — не панікуйце і не губляйцеся. Ратавальнікі раяць зрабіць глыбокі ўдых, акунуцца пад ваду з галавой, моцна ўхапіць рукой вялікі палец і пацягнуць ступню на сябе, пакуль нага не выпрастаецца цалкам. Затым адразу ж плывіце да берага.

Яшчэ адна небяспека, якая здараецца на вадзе, — вір. У такім разе варта набраць пабольш паветра ў лёгкія, паглыбіцца ў ваду і, зрабіўшы рывок у бок плыні, усплыць на паверхню. Калі ж вы патрапілі ў моцную плынь, не плывіце супраць яе: выкарыстоўвайце плынь, каб наблізіцца да берага.

Перашкодзіць купанню могуць таксама зараснікі багавіння. Заблытацца ў іх — справа, вядома, не зусім прыемная, аднак справіцца з раслінамі нескладана. Трымаючыся на плаву, спакойна падцягніце ногі і асцярожна вызваліцеся.

Нярэдка да гібелі на вадзе прыводзіць алкаголь. У нецвярозым стане людзей цягне на подзвігі. Не разлічыўшы ўласныя сілы, яны заплываюць на далёкія адлегласці і не ў стане ўжо вярнуцца да берага. Яшчэ адна памылка плыўцоў — купанне ў месцах, дзе гэта забаронена. У першую чаргу рызыка звязана з неабследаваным дном, якое ўяўляе небяспеку, і адсутнасцю ратавальнікаў або супрацоўнікаў Таварыства ратавання на водах. Адпачываючы на вадаёмах, дзе дзяжураць гэтыя спецыялісты, людзі ў любы момант могуць разлічваць на дапамогу.

### НЕ ПРАХОДЗЬЦЕ МІМА!

Калі, не дай бог, вы пачалі тануць, галоўнае ў такой сітуацыі — не панікаваць. Вядома, трымаць сябе ў руках вельмі складана, аднак неабходна. Варта супакоіцца, перавярнуцца на жывот або на спіну, раскінуць як мага шырэй рукі і ногі — так вы ўсплываеце на паверхню. Рукамі злёгку заграбайце ваду пад сябе, гэта таксама дапаможа заставацца на плаву. Трохі адпачыўшы, плывіце да берага.

«Сцвярджэнне, што выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў, дзейнічае не заўсёды, — адзначае намеснік начальніка цэнтра ўзаемадзеяння з грамадскасцю і СМІ МНС. — У пэўны момант ратаванне тапельцаў можа стаць справай вашых рук, і вы да такога павароту падзей павінны быць гатовы. Спачатку паклічце на дапамогу іншых людзей або ратавальнікаў, калі такія ёсць побач. Кіньце таму, хто тоне, ратавальны круг або доўгую вяроўку з вузлом на канцы. Калі ёсць лодка, то падплывіце да чалавека на ёй і паспрабуйце дапамагчы. Калі ж вы плаваеце добра і ўпэўнены ў сваіх сілах, паспрабуйце дабрацца да гора-плыўца самастойна. Наблізіўшыся, абхапіце яго ззаду за плечы і паспрабуйце пазбегнуць сутаргавых спроб ухапіцца за вас, плывіце з пацярпелым назад. Калі ж тапелец без прытомнасці, цягніце яго да берага, узяўшы рукой пад падбародак такім чынам, каб яго твар увесь час знаходзіўся над паверхняй вады. Папрасіце людзей, якія знаходзяцца побач, выклікаць хуткую. Па магчымасці прыступіце да аказання першай дапамогі».

Днямі ў Смаргоні відавочца выратаваў з вады жанчыну. Ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што ў гарадскім парку ў рацэ Оксне тоне жанчына. Падраздзяленні МНС неадкладна накіраваліся да месца здарэння. Да іх прыбыцця на дапамогу жанчыне прыйшоў відавочца. Іван Балыш пасля расказаў, што адпачываў з сям'ёй у парку, калі пачуў, што ў раку ўпаў чалавек. Не разважаючы, мужчына кінуўся на дапамогу. Тым часам яго жонка выклікала брыгаду хуткай дапамогі і паведаміла аб тым, што здарылася, праваахоўнікам. Мужчына выцягнуў пацярпелую на бераг. Жанчыну шпіталізавалі.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**


ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «Альфа-Банк», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 43-47 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Макаёнка, 11 | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машино-место № 380, инв. номер 500/D-978829827, общей площадью 17,9 кв. м | 20 986,91 |
| 2 | Машино-место № 384, инв. номер 500/D-978829842, общей площадью 13,0 кв. м | 26 638,07 |
| 3 | Машино-место № 385, инв. номер 500/D-978829845, общей площадью 13,0 кв. м | 26 638,07 |
| 4 | Машино-место № 410, инв. номер 500/D-978829948, общей площадью 12,7 кв. м | 26 638,07 |
| 5 | Машино-место № 418, инв. номер 500/D-978829979, общей площадью 13,0 кв. м | 26 638,07 |
| 6 | Машино-место № 420, инв. номер 500/D-978829984, общей площадью 13,0 кв. м | 26 638,07 |
| 7 | Машино-место № 421, инв. номер 500/D-978829988, общей площадью 13,0 кв. м | 26 638,07 |
| 8 | Машино-место № 556, инв. номер 500/D-978829881, общей площадью 17,8 кв. м | 20 884,09 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 26.03.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 01.07.2025 г. с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Слуцкая фабрика пошива одежды»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе:**

- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50250 (наименование – гараж) общ. пл. 23,4 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/1-2;**
- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50251 (наименование – склад с бытовым помещением), общ. пл. 265,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/1-1;**
- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50249 (наименование – склад), общ. пл. 65,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/1-4;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-27199 (наименование – швейно-массовый цех)** *(составные части и принадлежности: 4 пристройки, уборная)*, **общ. пл. 880,0 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/3;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-27204 (наименование – проходная), общ. пл. 9,0 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-114516 (наименование – гараж), общ. пл. 108,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/2.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001000065 *(право аренды по 07.04.2041)* площадью 0,7264 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б.**

*Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, 0,0832 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **199 572,29** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **19 957,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **07.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.07.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 956-36-00, (8029) 370-56-01.**

УНН 600154407

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ**

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества –
**Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк»**

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | Изолированное помещение с инвентарным номером 630/D-48930, расположенное по адресу: Минская область, Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 13-3, общей площадью 1145,2 кв. м |
| **Начальная цена продажи** | 1 243 808,57 белорусского рубля (Один миллион двести сорок три тысячи восемьсот восемь белорусских рублей 57 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 207 301,43 белорусского рубля (Двести семь тысяч триста один белорусский рубль 43 копейки) |
| **Сумма задатка** | 124 380,86 белорусского рубля |
| **Дата проведения аукциона** | **10.07.2025 в 11.00** |
| **Сроки и место подачи документов на участие** | **До 15.00 07.07.2025 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1-4, каб. 507** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону 8 (017) 3624955 |
| **Дополнительное условие** | Возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Возместить затраты на проведение оценки |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.



**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2025.Г.002.00119** по продаже земельных участков на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Тетерковский сельисполком, Витебская обл., Браславский район, деревня Тетерки, д. 35, тел. 8(02153) 6 03 77.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки** ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 24.06.2025 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 220889209601000170 площадью 0,2500 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Тетерковский с/с, аг. Иказнь, ул. Школьная, 8 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема (оз. Иказнь)), код – 2,13, площадь – 0,2500 га.

**Нач. цена: 2000,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в порядке», установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608. Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** до 16.00 23.06.2025.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by (№ 31078), на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru.


# ПОЛЬШЧЫ ПАГРАЖАЕ РАСКОЛ

## «Будзе працягвацца канфрантацыя»: эксперты — пра палітыку

**Выбары прэзідэнта ў Польшчы завяршыліся няўпэўненай перамогай Караля Наўроцкага — усяго менш за 2 % аддзялілі яго ад саперніка. Гэта дае падставу грамадству сумнявацца ў выніках галасавання, тым больш што падчас выбарчага працэсу адзначаліся парушэнні, якія маглі б пераважыць чашу вагаў у іншы бок.**

50,3 % галасоў на карысць Наўроцкага і 48,7 % — за Тшаскоўскага, пагадзіцеся, не вельмі пераканаўчая перамога прадстаўніка партыі «Права і справядлівасць». Польская газета Выбарча выйшла з загалоўкам на першай паласе «Расколіна Польшчы» (Trzask Polski — пол.), абыграўшы тым самым у загалоўку прозвішча другога кандыдата. А намёк вельмі празрысты — краіна расколатая на дзве часткі па выніках прэзідэнцкіх выбараў, і да чаго можа прывесці гэты раскол, сказаць складана...

**Расійскі палітолаг і грамадскі дзеяч Уладзімір КАРНІЛАЎ** бачыць у выніках цяперашніх выбараў у Польшчы пэўную тэндэнцыю, якая сведчыць аб палярызацыі меркаванняў выбаршчыкаў па тэрытарыяльным прынцыпе: «Адзін з галоўных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы — геаграфічны раскол. Да 70 % выбаршчыкаў паўднёвага ўсходу прагаласавалі за правага Наўроцкага. Да 60 % паўночнага захаду — за ліберала Тшаскоўскага. Пры прыкладнай роўнасці двух лагераў у цэнтры».

На яго думку, па меры набліжэння парламенцкіх выбараў гэты раскол можа толькі ўзмацніцца.

Што датычыцца беларускай тэматыкі, **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей КЛІШЭВІЧ** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» ацаніў, ці зменіцца палітыка Польшчы пасля перамогі Наўроцкага на выбарах.

На яго думку, змен у палітыцы Польшчы варта чакаць, толькі калі такая каманда паступіць ад ЗША.

— Трэба разумець, якую ролю адыгрывае прэзідэнт у Польшчы. Гэта больш намінальная пазіцыя, арбітр паміж органамі ўлады. Прымаюць асноўныя рашэнні і вызначаюць курс дзяржавы прэм'ер-міністр і парламент. Таму галасаванне было, хутчэй, не за канкрэтнага чалавека, яго прозвішча, біяграфію, праграму, а ў падтрымку або супраць дзейнага польскага ўрада, які ўзначальвае Дональд Туск. Як мы бачым па выніках, народ не задаволены палітыкай Туска, таму людзі падтрымалі кандыдата з іншага палітычнага флангу, — адзначыў Сяргей Клішэвіч.

Ён патлумачыў, што азначаюць вынікі выбараў для простага польскага грамадзяніна:

— Будзе працягвацца канфрантацыя паміж прэзідэнтам і ўрадам, парламентам. Ні да чаго добрага гэта не прывядзе. Могуць накладвацца абмежаванні па прыняцці таго ці іншага закона. Будзе адбывацца ўнутраная палітычная трасканіна. Многія рашэнні, якія маглі б быць эфектыўныя для польскай эканомікі, сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы, будуць вісець у паветры з усімі вынікаючымі негатыўнымі наступствамі для простага польскага грамадзяніна. Гэта не той варыянт, як у нас у краіне, калі Прэзідэнт вызначае палітыку, нясе адказнасць за развіццё дзяржавы, фактычна кіруе працэсамі па асноўных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця разам з урадам, парламентам і іншымі дзяржаўнымі органамі. У Польшчы прэзідэнт адыгрывае зусім іншую ролю. Таму мінулыя выбары паказалі сацыялагічны замер незадаволенасці грамадства палітыкай Туска.

Адказваючы на пытанне аб тым, ці варта чакаць змен у палітыцы суседняй дзяржавы, Сяргей Клішэвіч адзначыў:

— Вядома, не. Польшча — фарпост Злучаных Штатаў Амерыкі ў Еўропе. Яны скачуць пад тую дудку, якая грае ў Вашынгтоне. Якая б партыя ні прыйшла да ўлады з тых, хто прэтэндуе на гэта, Польшча сваю палітыку не зменіць без узгаднення з ЗША. Таму ўсё залежыць ад Трампа і яго адміністрацыі. Калі там будзе ўстаноўка наладжваць адносіны з Беларуссю і канструктыўна вырашаць пытанні, значыць польскае кіраўніцтва будзе гэтым займацца. І Туск, і Наўроцкі,

ГЛАБАЛЬНЫ КАНТЭКСТ

# ТЭАТР АБСУРДУ

## Драбнеюць палітыкі —

**Часам нават нязначная на першы погляд інфармацыя дае нагоду для разважання. У маім выпадку гэта была нататка аб тым, што ў Германіі адбылася цырымонія ўзнагароджання і ўручэння прэміі Карла Вялікага Старшыні Еўракамісіі Урсуле фон дэр Ляен. Прыродная дапытлівасць прымусіла больш падрабязна паглыбіцца ў пытанне, а вынік — падзяліцца ўласнымі меркаваннямі.**

### ШТО НАПІШУЦЬ НА МЕДАЛІ УРСУЛЫ?

Для пачатку крыху гісторыі. Міжнародная прэмія Карла Вялікага, заснавальніка Франкскай імперыі Шарлемана, лічыцца адной з самых ганаровых узнагарод у Еўропе — яе прысуджаюць з 1950 года тым, хто зрабіў выдатны ўнёсак у справу аб'яднання кантынента. Цырымонія ўручэння традыцыйна праходзіць у нямецкім горадзе Ахене ў дзень свята Узнясення Гасподняга, якое ў 2025-м выпала на 29 мая.

Лаўрэаты Прэміі Карла Вялікага ўзнагароджваюцца спецыяльнай граматай, медалём і сімвалічнай прэміяй у памеры 5 тысяч еўра. На пярэднім баку памятнага медаля выбіта самога імператара і старадаўняя пячатка Аахена XII стагоддзя, на адваротным — гравіруецца заслуга канкрэтнага лаўрэата перад еўрапейскімі народамі. Сярод узнагароджаных у розныя гады: Генеральныя сакратары НАТА (Поль-Анры Спаак, Ёзэф Лунс, Франсіска Хаўер Салана), вядомыя палітыкі (Конрад Адэнаўэр, Уінстан Чэрчыль, Генры Кісінджэр, Франсуа Мітэран, Гельмут Коль, Біл Клінтан, Ангела Меркель), Джордж Маршал, рымскія папы (Іаан Павел ІІ і Францыск). Дастаткова разнастайнае, але зразумелае для ўспрымання кола асоб, аб'яднаных ідэяй антысаветызму і пэўнымі заслугамі перад Еўропай.

Што ж будзе на адваротным баку медаля ў якасці заслуг Урсулы фон дэр Ляен?

Згодна з афіцыйным сайтам Еўрасаюза, «камітэт прэміі Карла Вялікага адзначыў заслугі фон дэр Ляен у барацьбе з пандэміяй каранавіруса, у стрымліванні Расійскай Федэрацыі і ў прасоўванні «зялёнай здзелкі» ЕС — комплексу мер, з дапамогай якіх Еўрапейскі Саюз мае намер да 2050 года дабіцца кліматычнай нейтральнасці».

### РАБІЦЕ ГОРШ — І ВАС АЦЭНЯЦЬ

Удумайцеся, паважаныя чытачы, палітык узнагароджваецца за тое, што зрабіў жыццё еўрапейскіх краін і іх грамадзян істотна горшым. З пачатку 2023 года вялося расследаванне супраць фон дэр Ляен па абвінавачанні ў карупцыі пры закупцы вакцын супраць каранавіруса. У 2025-м Еўрапейскі суд прызнаў яе адказнай за ўтойванне перапіскі з кіраўніцтвам карпарацыі Pfizer па кантрактах на мільярды еўра.

Больш за тое, згодна з дакладам Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША па выніках двухгадовага расследавання прычын узнікнення пандэміі COVID-19 і ацэнак дзейнасці дзяржаўных структур у гэты перыяд, які выйшаў 3 снежня 2024 года, практычна ўсе рэалізаваныя меры былі памылковымі. Гэта датычыцца захавання сацыяльнай дыстанцыі ў два метры і абавязковага нашэння масак, лакдаўнаў і жорсткіх каранцінаў, закрыцця школ і грамадскіх устаноў. Усё гэта ўкаранялася Еўракамісіяй на чале з яе старшынёй і нанесла шкоду эканоміцы, псіхічнаму і фізічнаму здароўю насельніцтва.

Другі пункт гаворыць пра ўнёсак лаўрэата ў прасоўванне «зялёнай здзелкі», якая падарвала эканоміку Германіі і шэрагу іншых еўрапейскіх краін. Паводле даных Статыстычнага ўпраўлення Еўрапейскага саюза (Eurostat), у студзені 2024 года аб'ём прамысловай вытворчасці ў ЕС скараціўся на 2,1 % у параўнанні з папярэднім месяцам, а ў параўнанні са студзенем 2023-га — на 5,7 %. У еўразоне зніжэнне прамвытворчасці ў студзені склала 3,2 % у месячным выражэнні і 6,7 % — у гадавым. Шэраг краін нарасціў закупкі нафты, газу, вугалю для ўласных патрэб. Планы па дасягненні вугляроднай нейтральнасці ў маштабах усяго Еўрасаюза недазабяспечаны фінансава на 87 млрд еўра за год, а ў Еўракамісіі прыярытэтам становіцца бяспека і супрацьдзеянне Расіі.

Знішчыўшы ўласныя канкурэнтныя перавагі, Еўропа актыўна ўзбройваецца, і вось у гэтым галоўная заслуга лаўрэата Прэміі Карла Вялікага. Менавіта чарговы этап мілітарызацыі, русафобія і рэваншызм заахвочаны ў 2025 годзе. «Дранг нахт остэн», абяцаныя менавіта вуснамі Урсулы фон дэр Ляен, мільярды еўра на ўзбраенне і курс на

# ГРАМАДСТВА?

## краіны-суседкі пасля прэзідэнцкіх выбараў

і іншыя. Калі ж такой устаноўкі не будзе, адпаведна, пацяпленне адносін паміж нашымі краінамі чакаць не варта.

Гаворачы пра самога Наўроцкага, дэпутат падкрэсліў, што гэта чалавек, на чыім сумленні дзясяткі, калі не сотні, разбураных помнікаў савецкім салдатам, якія аддалі свае жыцці за свабоду Польшчы.

— Гэта антысавецкая, антыкамуністычная ідэалогія ў корані разыходзіцца з той палітыкай, што мы рэалізуем. Таму ён апрыёры настроены супраць нас, нашай дзяржавы. Усё тое, што мы спрабуем захаваць, за што мы змагаемся, ён разбурае, знішчае. Як ужо неаднаразова заяўлялася, мы заўсёды адкрытыя да дыялогу. Але, зноў жа, мы нікому не дазволім таптацца па нашай гісторыі. З такой пазіцыяй цяперашняга польскага прэзідэнта размаўляць з ім будзе вельмі праблематычна нават без якіх-небудзь установак палітычнаму кіраўніцтву Польшчы з-за акіяна, — падкрэсліў Сяргей Клішэвіч.




Ну і вішанька на торце — Трамп пракаментаваў выбары ў Польшчы.

Амерыканскі лідар пракаментаваў у сацсетцы Truth Social вынікі выбараў у Польшчы, паведамляе ТАСС. Ён адзначыў, што перамогу атрымаў яго «саюзнік».

«Саюзнік Трампа перамагае ў Польшчы, шакіруючы ўсю Еўропу», — працытаваў Трамп тэлеканал Newsmax на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Truth Social.

Раней міністр унутранай бяспекі Злучаных Штатаў Крысці Ноэм раскрытыкавала кандыдата ад кіруючай партыі «Грамадзянская кааліцыя» Рафала Тшаскоўскага і падтрымала кандыдата ад апазіцыі Караля Наўроцкага. Яна паабяцала падтрымку ЗША, калі палякі «выберуць лідара, які будзе супрацоўнічаць» з Трампам. Такім палітыкам, як мяркуе Ноэм, з'яўляецца Наўроцкі.

Між іншым, **палітолаг, расійскі грамадскі дзеяч Барыс ЯКЕМЕНКА** ў праекце «У тэме» на YouTube-канале БелТА, ацэньваючы вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы, адзначыў, што сам працэс — нейкі рытуал, які мае ўсё меншае значэнне.

«Ва Украіне выбары наогул не адбыліся — і што? А гэта ж еўрапейскі прэцэдэнт. Еўропа вельмі часта бярэ на ўзбраенне гэтыя прэцэдэнты, напрыклад, з Прыбалтыкі, з Украіны. Гэта такая эксперыментальная пляцоўка. Можна не праводзіць выбары? Можна! Ніхто не пярэчыць? Ніхто! Значыць, і ў іншых еўрапейскіх краінах у нейкі момант можна будзе зрабіць гэтак жа. Гэта значыць, праводзяцца такія сацыяльныя замеры», — сказаў Барыс Якеменка.

Вяртаючыся да тэмы прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы, палітолаг падкрэсліў, што на знешнюю і ўнутраную палітыку яны ніяк не паўплываюць. «У любым выпадку крыўда былой калоніі на сваю метраполію — Расію — застанецца. У Польшчы заўсёды кісла ставіліся і да савецкіх людзей, і да расіян. Так ці інакш яны будуць асляплены гэтай агідай і нянавісцю, а значыць, заўсёды будуць рэсурсам у нечых руках. Таму што заўсёды знойдуцца тыя, хто будзе падкормліваць гэту нянавісць. То-бок яны самі сябе ставяць у тыя ўмовы, пры якіх не могуць быць суверэннымі», — упэўнены ён.

# ПА-ЕЎРАПЕЙСКУ

## абясцэньваюцца і ганаровыя прэміі



рэанімацыю НАТА, недапушчэнне спынення вайны на Украіне — вось сапраўдныя заслугі кіраўніка Еўракамісіі. Дарэчы, і памер прэміі ў 2025-м упершыню ў гісторыі склаў мільён еўра (да афіцыйных 5 тысяч астатнія 995 шчодра дадалі спонсары).

### СПАДКАЕМЦЫ «АЎСТРЫЙСКАГА МАСТАКА»

Ацэнкі ўзнагароджання кіраўніка Еўракамісіі вельмі неадназначныя. Так, у інтэрв'ю Euronews прафесар права ЕС у HEC Paris Альберта Алемана заявіў: «Калі сэнс прэміі Карла Вялікага заключаецца ў тым, каб адзначыць наватарскае мысленне і дзеянні ў беспрэцэдэнтныя для кантынента геапалітычныя часы, то яна павінна ўзнагароджваць творчых і смелых асоб, а не інстытуцыйныя фігуры ў народзе. З гэтага пункту гледжання ўручэнне ёй прэміі выглядае хутчэй як святкаванне яе палітычнага выжывання, чым як прызнанне ўнёску ў інтэграцыю ЕС».

Не выклікае сумнення, што калі б Прэмія Карла Вялікага існавала ў 30-я гады XX стагоддзя, то яе лаўрэатам стаў бы тагачасны фюрэр нямецкай нацыі. Сёння ж яе атрымлівае навaспечаны «фюрэр» Еўропы. Невыпадкова ў сваёй прамове Урсула фон дэр Ляен падкрэсліла «неабходнасць умацоўваць абарону, развіваць інавацыі і пашыраць ЕС». Далей была мудрагелістая фраза, сутнасць якой простая — Еўропе пара накачваць мышцы. «Дарагія сябры, незалежная Еўропа. Я ведаю, што для некаторых гэта непрыемнае пасланне. Але ў аснове яго ляжыць наша воля. Як даўно вядома народам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, асабістая свабода магчымая толькі пры наяўнасці калектыўнай незалежнасці».

Прысутны на цырымоніі канцлер ФРГ Мерц, кажучы аб найбольш актуальных геапалітычных праблемах, якія стаяць перад еўрапейскім кантынентам, заявіў, што «Германія гатова зрабіць свой унёсак у вырашэнне задач, што стаяць перад ёй, у цесным супрацоўніцтве з іншымі еўрапейскімі краінамі. Еўропа была заснавана для таго, каб служыць сваім народам, і яго пакаленне — першае, якое вырасла ў Еўропе свабоды, міру і працвітання, — атрымала гэту спадчыну ад бацькоў-заснавальнікаў, падкрэсліўшы агульную адказнасць за падтрыманне і абарону гэтых каштоўнасцяў у будучыні». Вось так, ні больш, ні менш.

### ЗМЯНЯЕЦЦА ВОКЛАДКА, АЛЕ НЕ ЗМЕСТ

На падобным фоне застаецца толькі сказаць: «Каментарыі залішнія!» Аднак сайт прэміі Карла Вялікага дае яшчэ нямала пажытку для развагі. У прыватнасці, лаўрэатам 2023 года былі названы ўкраінскі народ і Зяленскі, якія, на думку членаў журы, «абараняюць не толькі суверэнітэт сваёй краіны і жыцці яе грамадзян, але і Еўропу і еўрапейскія каштоўнасці». І гэта пры пастаянных заявах заходняга істэблішменту аб «няўдзеле ва ўкраінскім канфлікце».

Сур'ёзную насцярожанасць выклікаюць словы Мерца, вымаўленыя ў адрас Урсулы фон дэр Ляен: «Ты даеш Еўропе голас у свеце, еўрапейскі голас! Еўрасаюз быў паспяховым праектам міру ўнутры Еўропы, і цяпер Еўропа павінна стаць праектам міру ў знешняй палітыцы». Яму падтакваюць члены камітэта прэміі: «Еўрапейская мадэль жыцця, заснаваная на свабодзе, міры, дэмакратыі і росквіце, знаходзіцца пад пагрозай. Сусветны парадак мяняецца, і Еўропа павінна дзейнічаць».

Усё гэта прагучала для мяне рэхам чацвёртага дзесяцігоддзя XX стагоддзя і не толькі для мяне. Амерыканскі палітолаг Гілберт Дактароу на сваім YouTube-канале заявіў: «Палітыка ФРГ па эскалацыі канфлікту на Украіне дакладна сведчыць пра рэваншысцкія настроі ў нямецкага канцлера Фрыдрыха Мерца... Каля дзесяці гадоў таму ў Германіі пачалі гучаць заявы аб тым, што новыя пакаленні не нясуць ніякай віны за дзеянні продкаў. Цяпер мы бачым, як нямецкія палітыкі пачынаюць павучаць Маскву. Больш за тое, развіваецца самыя сапраўдныя рэваншысцкія настроі, і Мерц таму самы яскравы прыклад», — падкрэсліў ён.

Упэўнены, што гісторыя ўсё расставіць на свае месцы, а праўда пераможа, як гэта ўжо было. Аднак сёння даводзіцца жыць ва ўмовах, калі віртуальны свет спрабуюць падаць рэальным, калі чорнае называюць белым, а зло камуфлююць пад дабро. У Еўропе зноў паднімае галаву фашызм і з'яўляюцца чарговыя «фюрэры». Змяняецца вокладка, але не змест. А інфармацыйная машына стварае ілюзію дабрабыту.

У завяршэнні хацелася б нагадаць словы чэшскага пісьменніка Юліуса Фучыка, пакаранага фашыстамі: «Людзі, будзьце пільныя!» Сёння яны як ніколі актуальныя.

**Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук, прафесар.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ООО «Химтэкинвест»** (организатор торгов) извещает о проведении четвертого повторного открытого **аукциона** на повышение начальной цены

**СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ ПЕРВОГО АУКЦИОНА НА 55 %**

по реализации объекта недвижимости: «Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-76236.

Назначение: **Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства.**
Наименование: **Автомобильная заправочная станция с комплексом сервисных услуг автодороги Брест – Минск – граница РФ (11 км справа).**

Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000187 площадью 1,5531 га (согласно решению Брестского горисполкома № 606 от 14 апреля 2025 года площадь участка стала 1,5520 га) (право аренды по 25.11.2104, доля 1/1) в г. Брест, ул. Калиновая, 115.
Собственник имущества – ООО «КД-Инвест» УНП 391298470, тел./факс (0214) 50-01-88.

**Начальная цена – 985 500 белорусских рублей.**
**Сумма задатка – 9 850 белорусских рублей.**
**Шаг торгов – 49 275 белорусских рублей.**
Цена без НДС (НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).
Данный лот находится в обременении, в ипотеке и аренде.
Начало подачи заявок – 06 июня 2025 года – 09.00.
Окончание подачи заявок – 17 июня 2025 года – 09.00.
Заявки на участие в торгах принимаются по адресу: 211443, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11А, пом. 20.
Организатор торгов – ООО «Химтэкинвест» УНП: 191685984.
При необходимости ознакомиться с документами и предметом аукциона направлять запрос на электронную почту producomob2016@mail.ru или обращаться по тел. 8-0339033614.

**Начало торгов 19 июня 2025 года в 09.00 по адресу: г. Новополоцк ул. Молодежная 11А, комн. 20.**

Торги проводятся при наличии двух и более допущенных к торгам участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. К участию в торгах допускаются физические и юридические лица, подписавшие соглашение до начала торгов об ознакомлении с предметом торгов и копиями договоров аренды; зарегистрированные в журнале регистрации заявлений; предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах, копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей; доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Физическим лицам – предъявить паспорт, иной документ, подтверждающий личность.

Задаток перечисляется на р/с. Номер счета (IBAN): BY13SLAN30 124208400000100000 в г. Минск, ЗАО БАНК ВТБ (БЕЛАРУСЬ), код банка (BIC): SLANBY22, УНП: 191685984, ООО «Химтэкинвест» до подачи Заявки на участие в аукционе, назначение платежа: «Задаток за участие в торгах по капитальному строению с инвентарным номером (указать номер)»; для иностранных участников реквизиты для оплаты Задатка запрашивать у Организатора торгов.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после дня проведения торгов (физическим лицам – на карт-счет, указанный при регистрации; юридическим лицам, ИП – на расчетный счет).

Участнику, выигравшему торги, задаток не возвращается и учитывается в счет оплаты предмета торгов по договору купли-продажи. Победитель торгов (либо единственный участник, давший согласие на приобретение лота), т. е. покупатель, подписывает протокол по результатам торгов в день его проведения и в обязательном порядке возмещает затраты на организацию и проведение торгов в размере **332,64 бел. руб.** в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения торгов, а также обязан заключить договор купли-продажи с собственником предмета торгов в течении 5-х рабочих дней после проведения аукциона. Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с заключенным договором.

В случае если к участию в торгах был допущен только один участник, он может приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов (т. е. начальная цена + 5 % + затраты на организацию и проведение торгов) путем подтверждения приобретения в день торгов.

Продавцом предоставляется отсрочка оплаты предмета аукциона 60 дней с момента переоформления имущества на покупателя.

В случае отказа или уклонения победителя торгов (или единственного участника, давшего согласие на приобретение лота) от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов, результаты торгов аннулируются, внесенный им задаток возврату не подлежит, а включается в состав имущества собственника предмета торгов.

Организатор оставляет за собой право отменить аукцион без объяснения причин не менее чем за трое суток до начала его проведения. *Ранее опубликованные объявления о предыдущих торгах 28 декабря 2024 года, 05 февраля 2025, а также 09 апреля 2025 года и 14 мая 2025 года в этом же издании*

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, бел. руб. (без НДС) | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1: Грузовой фургон ВИС 2345, год выпуска 2001 г., кузов № XTA21053021925980/ X6D23450020005793, транзитный номер 1 ККТ 8200** | 1 100,00 | 110,00 |

**Местонахождение объектов:** г. Брест, ул. Фомина, 15. **Продавец:** Прокуратура Брестской области, 224701, г. Брест, ул. Фомина, 15, тел./факс 80162278627. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа – 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 08 июля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 07 июля 2025 г. до 17.00**

# МАЦІ І ДЗІЦЯ — РУЖА І ЦЮЛЬПАН

**Па гарызанталі: 3.** Малыя дзеткі, што чыстыя ... : і свецяць, і радуюць у цёмную ночку (*прык.*). 1 чэрвеня — Міжнародны дзень абароны дзяцей і Сусветны дзень бацькоў. **8.** Загадка. **9.** « ... , якую маці спявае ля калыскі, суправаджае чалавека ўсё жыццё». Г. Бігер. **10.** Дзеці не ў цяжасць, а ў ... (*прык.*). **13.** Тое, што і збан (*разм.*). **14.** «На першым месцы павінны быць Радзіма і ... , затым дзеці і ўся сям'я». Цыцэрон. **15.** Падарожны куфэрак. **18.** Невялікая птушка сямейства ўюрковых. **19.** Тонкі слой ледзяных крышталёў. **22.** Цэлы дзень касіў ... , а за вечар каза з'ела (*прык.*); чэрвень — сенакосная пара. **23.** «Прырода — ... усіх тварцоў». І. Гётэ; 5 чэрвеня — Сусветны дзень абароны навакольнага асяроддзя. **26.** Рыбалоўны кручок з трыма зубцамі (*разм.*). **28.** Рэшта. **30.** Бура на моры. **31.** Вецер не заўсёды дзьме так, як хоча ... (*прык.*); 15 чэрвеня — Сусветны дзень ветру. **32.** Ранняя маладосць.

**Па вертыкалі: 1.** Чэрвень не гуляе — ... люляе (прык.). **2.** Які ... , такі і клін, які бацька, такі і сын (*прык.*). **4.** Той, хто дае параду. **5.** Слава, пашана. **6.** Дом саграе не ... , а любоў і згода ў сям'і (*прык.*). **7.** Вясёлы, цікавы часопіс для дзяцей. **11.** «Разважлівасць бацькі ёсць самае дзейснае ... для дзяцей». Дэмакрыт. **12.** Родная зямелька, як зморанаму ... (*прык.*). **16.** Бацька за ... , а дзеці за пірог (*прык.*). **17.** Маці і ... — ружа і цюльпан (*прык.*). **20.** «Часы мяняюцца: машына цяпер неабходнасць, а дзеці — ...». Цытата невядомага аўтара. **21.** «Будзе тут ... , // Будзе тут рабінка». З верша Я. Купалы «Перад Сёмухай»; старажытнае свята Сёмуху, або Тройцу, сёлета адзначаюць 8 чэрвеня. **24.** Буйная прыгожая, але не пахучая кветка. **25.** Паклоннік усяго прыгожага. **27.** Даўгахвосты папугай. **29.** У сям'ю, дзе ... , шчасце дарогу не забывае (*прык.*).



**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 3.** Зорачкі. **8.** Рэбус. **9.** Песня. **10.** Радасць. **13.** Жбан. **14.** Бацькі. **15.** Баул. **18.** Шчур. **19.** Іней. **22.** Сена. **23.** Тварэц. **26.** Якар. **28.** Астатак. **30.** Шторм. **31.** Марак. **32.** Юнацтва.

**Па вертыкалі: 1.** Ураджай. **2.** Дуб. **4.** Радца. **5.** Чэсць. **6.** Печ. **7.** «Вясёлка». **11.** Павучанне. **12.** Пасцелька. **16.** Парог. **17.** Дзіця. **20.** Раскоша. **21.** Бярозка. **24.** Астра. **25.** Эстэт. **27.** Ара. **29.** Лад.

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК | 758 мм рт.сл. | +13..+15°С / +24..+27°С |
| ВІЦЕБСК | 759 мм рт.сл. | +13..+14°С / +25..+27°С |
| МАГІЛЁЎ | 760 мм рт.сл. | +13..+15°С / +25..+27°С |
| ГОМЕЛЬ | 762 мм рт.сл. | +14..+15°С / +25..+26°С |
| ГРОДНА | 756 мм рт.сл. | +16..+17°С / +23..+26°С |
| БРЭСТ | 758 мм рт.сл. | +17..+18°С / +26..+27°С |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Першая чвэрць 03.06—10.06. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз., 22 гадз.

Абазначэнні:
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура
— умераная геамагнітная бура

**...у суседзяў**

МАСКВА +25..+27°С

С.-ПЕЦЯРБУРГ +23..+25°С



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

### ЗАКІНУЎ ДЗЕД НЕВАД... ГЭТА — У КАЗЦЫ

**Не ведаю, як іншыя, а я дык не вельмі люблю размаўляць з жанчынамі, бо ў іх жа — ну, у большасці — дзве тэмы на языках: альбо якія геніяльныя іх дзеці і ўнукі (а чужыя — дык дрэнныя-тупыя), альбо што варылі-купілі... Карацей — нічога цікавага.**

Зусім іншая справа — пагутарыць з мужчынамі. У іх размовы нашмат круцейшыя, як спяваў Высоцкі: пра тога ж Уладзіміра Сямёнавіча ды іншых творцаў, пра палітыку, мінуўшчыну, вайсковую службу, машыны, спорт... А ўжо пра паляванне з рыбалкай дык яны ведаюць, здаецца, усё! Могуць расказаць, якая рыба і дзе канкрэтна нерастуе, як адбываецца гэты «працэс»...

Напрэдадні яго, што цікава, спаважныя самЫ (вага асобных пад 300 кіло) «будуюць», выкопваюць гняздо. Там іхнія самкі адкладваюць ікру і... сплываюць у невядомым напрамку. Увесь клопат пра будучых дзяцей бяруць на сябе самцы. Меназіта яны (мужчынам бы павучыцца!) тыднямі не ядуць, не п'юць — клапоцяцца пра будучых дзяцей, як зрэнку вока ахоўваюць іх ад розных драпежнікаў.



Ад рыбакоў ахоўваць цяжэй. Ды што там — амаль немагчыма.

...Нашы вось на беразе Дняпра, пад вербамі, столік сабе зрабілі, невялікую печку зварганілі, нават канапу прыцягнулі, якую нехта выкінуў.

Усё там, карацей, для годнага адпачынку. І па рыбу хадзіць зусім не трэба: лешчык паблізу файна клюе. Пад настрой можна юшку зварыць. А ўжо тады размоў... КатЫ і тыя з ваколіц збіраюцца — прыходзяць паслухаць.

Дык вось здаралася (праўда, некалі даўней), што рыбу лавілі па-варварску — з дапамогай толу. Гэта значыць, шашку з запалам у ваду шпурнулі — рванула... Рыба, глядзіш, усплыла — застаецца сабраць.

Нейкага разу толькі прыступілі — бачаць, з-за павароту Дняпра чэрці нейкую маторку нясуць, і рыбакі ў ёй зусім незнаёмыя. Але ж, мусіць, згледзелі, што рыба плавае, што яна як быццам нічыя — «і ўсе збіраюць», дык чаму б не далучыцца?

А нашы «рыбакі» дзяліць з некім «улоў» зусім не збіраліся: чужынцаў трэ было неяк адагнаць. Пытанне — як?

Пры іх для таго, каб «супакойваць» тую ці іншую рыбіну, булыжнік быў, навязаны на вяроўку. Якраз гэту «прыладу» адзін з мужчын падхапіў ды і пульнуў у той бок, дзе гудзела маторка.

Пасажыры яе падумалі, што ляціць не іначай як тол: з лодкі сіганулі ў ваду, паплылі да берага.

Нашым таксама не да рыбы стала: завялі матор і ходу, праўда, у іншы бок.

І для адных, і для другіх не задалася тая «рыбалка», але ж браканьерыць заракліся не пасля яе, а нашмат пазней. Штрафы спрацавалі. Апошнім часам рыбакі не тое што тол, нават сетку закінуць баяцца. Паціху-памалу на вуды перайшлі: стаяць сабе радком на беразе, ловяць і потым здымаюць — не толькі з кручка, а яшчэ і на фота, каб пахваліцца (хоць дзесяць разоў адным тым сомам ці ўловам). А галоўнае — смела, з задавальненнем, без ніякага страху. Пра яго, перажыты, хіба што ўспаміны — пад юшку, прычым небескарысныя.

Мясцовы бакеншчык, расказвалі, некалі моду меў знянацку падляцець на сваёй маторцы і чужую рыбу ў лодку сабраць. Ведаеце, як адвучылі? Услед яму кавалак гаспадарчага мыла кінулі. Спужаўся, бядак, акурат як тыя чужынцы: выскачыў з лодкі — пабег па вадзе «акі посуху» і пасля вось гэтага больш ніколі на чужое не кваліўся.

**Соф'я Кусянкова,**
*Рагачоўскі раён.*

## 4 ЧЭРВЕНЯ — Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1810** год — пачалося ўзвядзенне Бабруйскай крэпасці. У земляных работах было занята 13 батальёнаў з войскаў Рэзервовай арміі генерала М. А. Міларадавіча. Камандуючым войскамі на будаўніцтве ў Бабруйску быў прызначаны генерал-маёр Г. А. Ігнацьеў. Акрамя салдат для ўзвядзення крэпасці прыцягваліся наёмныя спецыялісты з Магілёўскай, Мінскай і Чарнігаўскай губерняў.

**1969** год — заснаваны Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны запаведнік з мэтай захавання ўнікальных ландшафтаў Палесся. Парк размешчаны ў даліне ракі Прыпяць у цэнтры буйной забалочанай Палескай нізіны.

У свеце

**469** год да н. э. — нарадзіўся Сакрат, старажытнагрэчаскі філосаф. Таксама найбольш загадкавая асоба з усёй гісторыі філасофіі. Да нас не дайшло ні радка яго твораў, аднак ён належыць да тых, хто зрабіў самы вялікі ўплыў на развіццё заходняй філасофскай думкі. Па гэтай прычыне пра ўсё, што датычыцца Сакрата, мы можам меркаваць выключна са слоў яго сучаснікаў, і таму вельмі цяжка адрозніць погляды Сакрата ад пазіцыі яго вучняў і паслядоўнікаў.

**1880** год — вынаходнік Аляксандр Мажайскі падаў заяўку на атрыманне прывілею на паветраплавальны снарад — самалёт з паравым рухавіком. Гэта быў першы ў Расіі (і адзін з першых у свеце) патэнт на лятальны апарат, цяжэйшы за паветра.

**1916** год — Першая сусветная вайна: пачатак Брусілаўскага прарыву, буйной паспяховай наступальнай аперацыі рускай арміі.

**1968** год — падчас перадвыбарнай кампаніі забіты Роберт Кенэдзі, брат прэзідэнта ЗША Джона Кенэдзі, застрэленага за пяць гадоў да таго.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 928 Індэкс 63850. Зак. № 1302.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 чэрвеня 2025 года.